*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 СТУДЗЕНЯ 2008 г. СУБОТА

№ 2 (26115)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## ПРАВАСЛАЎНЫМ ХРЫСЦІЯНАМ БЕЛАРУСІ

*Дарагія суайчыннікі!*

*Сардэчна віншую вас з Раджджаством Хрыстовым.*

*Гэтае вялікае свята зблiжае ўсіх нас, раскрывае сэрцы насустрач дабру і міласэрнасці. Дапамагае яшчэ лепш усвядоміць вечнае значэнне самых галоўных жыццёвых каштоўнасцяў — моцнай, дружнай сям'і, надзейнага хатняга ачага, міру і згоды на роднай зямлі. Напаўняе душу жаданнем дапамагаць людзям, дзяліцца з імі цяплом і каханнем.*

*У гэтыя дні мы аддаём даніну павагі Беларускай Праваслаўнай Царкве, чыя дзейнасць на працягу стагоддзяў служыць высакародным мэтам — яднанню, умацаванню даверу і ўзаемаразумення ў грамадстве.*

*Няхай Раджджаство Хрыстова прынясе дабрабыт і ўтульнасць у вашы дамы, натхніць на добрыя пачынанні і справы.*

*Жадаю вам моцнага здароўя, поспехаў, шчасця і цудоўнага настрою.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

**СА «ЗВЯЗДОЙ» — І Ў НОВЫМ ГОДЗЕ**

**Заканчваецца падпіска на І квартал і І паўгоддзе 2008 года. Заставайцеся з намі!**

## Раджджэственскае пасланне

### Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Узлюбленыя архіпастыры, пастыры, манахі і ўсе верныя дзеці Беларускай Праваслаўнай Царквы!

«Бога ніхто не бачыў ніколі; Адзінародны Сын, Які ва ўлонні Айца, Ён явіў.» (Ін. 1: 18)

Гэтыя словы апостала і евангеліста Іаана Багаслова адкрываюць нам неспасціжныя тайны быцця Бога ў Трох Асобах і спасіцельнай для чалавецтва місіі Яго Адзінароднага Сына.

Са старажытных часоў людзі адважна шукалі сустрэчы з ісцінным Богам на сцяжынах свайго жыцця, каб іх знаходжанне на зямлі і адыход у вечнасць былі асветлены святлом праўды Божае.

Але нават калі Гасподзь адкрываў перад чалавекам скарбы Сваёй прамудрасці, якая захоўваецца адвеку ў Свяшчэнным Пісанні, — нават і тады не кожны быў гатовы прыняць Закон Жыцця і кіравацца яго спасіцельнымі запаведзямі. З глыбіні стагоддзяў даносяцца да нас скрушныя словы старазапаветнага праведніка, свяшчэнніка Ездры:

«Якая карысць нам, калі нам паабяцаны бессмяротны час, а мы рабілі смяротныя справы? Нам прадказана вечная надзея, а мы... зрабіліся мітуслівымі, нам падрыхтавана жыллё здароўя і спакою, а мы жылі дрэнна... хадзілі па шляхах злых» (3 Езд. 7: 49—52).

Ішлі стагоддзі, міналі тысячагоддзі... Чалавечы род сталеў, а са сталеннем памнажаліся яго грахі і хваробы. Ён заставаўся па-ранейшаму жорсткім, але без Бога ўсё вастрэй перажываў сваю адзіноту. Бо сэрца чалавека, часам, насуперак яго характару, з гадамі ўсё больш жадае і міласэрнай спагады, і благадатнай дапамогі Божай.

І тады Бог Айцец прамовіў Слова Любові, і «Слова стала плоццю, і жыло сярод нас, поўнае благадаці і ісціны» (Ін. 1: 14).

Так Сын Божы стаў Сынам Чалавечым. Вечны — Ён нарадзіўся на зямлі, каб пражыць жыццё чалавека і памерці, як памірае чалавек. Усемагутны — спазнаў увесь цяжар жыцця ў пакутнай і смяротнай плоці. Ён, Бязгрэшны, узяў на Сябе грахі ўсяго свету і адкупіў іх, стаўшы падобным да старазапаветнага ахвярнага агнца.

І ўсё гэта нам зноў тлумачыць апостал і евангеліст Іаан Багаслоў: «Бог ёсць любоў, і хто не любіць, той не спазнаў Бога» (1 Ін. 4: 8); «Бог ёсць святло, і няма ў Ім ніякай цемры» (1 Ін. 1: 5); «Бог ёсць дух, і тыя, што пакланяюцца Яму, павінны пакланяцца ў духу і ісціне» (Ін 4: 24).

Якія простыя для разумення гэтыя адкравенні пра Бога, Раджджаство Якога мы святкуем сёння! Яны настолькі ж блізкія і натуральныя для чалавечай прыроды, як жаданне любові і аднадумства з дарагімі людзьмі, як пошук сапраўднага сяброўства і вернасці, як успамін альбо мара пра цяпло бацькоўскага дома і пра бесклапотнае дзяцінства...

Свята Раджджаства Хрыстовага ззяе самымі яркімі і чыстымі колерамі дзяцінства; ён такі ж таямнічы і велічны ў сваёй прастаце, як і Самое Богадзіця Ісус, Якое мірна спіць у яслях, асветленае ззяннем Віфлеемскай зоркі і сагрэтае дыханнем свойскіх жывёл. І нішто не можа парушыць спакою гэтай ціхай Раджджэственскай ночы, калі хор небажыхароў заклікае зямных жыхароў заспяваць гімн спрадвечнай гармоніі: «Слава ў вышніх Богу, і на зямлі мір, у людзях добрая воля!»

Узлюбленыя браты і сёстры! Нашым хрысціянскім пакліканнем было і застаецца здзяйсненне ў жыцці гэтага Раджджэственскага ангельскага песнапення. Бо місіяй хрысціяніна з'яўляецца якраз тое, каб ва ўсякі час і ва ўсіх жыццёвых абставінах умець узносіць славу ў вышніх Богу!

Нібы тлумачачы сэнс Раджджэственскага гімна, Сам Хрыстос Спасіцель настойліва пераконваў вернуючых у Яго: «па тым пазнаюць усе, што вы Мае вучні, калі любоў будзеце мець паміж сабою» (Ін. 13: 35), бо, дзе царствуе евангельская любоў, — на той зямлі ўсталёўваецца надзейны мір.

Але праслаўляць Бога і ўмацоўваць мір можа толькі той, чыя асабістая воля нязменна скіравана на дабро бліжніх і дальніх людзей. Таму выхаванне ў сабе добрай волі з'яўляецца мэтаю нашага з вамі зямнога жыцця.

Урэшце, для таго мы і ўзводзім храмы і манастыры, адкрываем духоўныя школы і развіваем багаслоўе, даследуем гісторыю Царквы і Бацькаўшчыны, каб прынесці ў жыццё радасць Раджджаства і Уваскрасення Хрыстовага. Бо ў прасторы паміж гэтай альфай і амегай нашай хрысціянскай веры знаходзіцца вялікая радасць злучэння Бога з чалавекам, — тая самая, пра якую дабравесціў Віфлеемскім пастухам у ноч Раджджаства Ангел Гасподні, кажучы: «нарадзіўся вам сёння ў горадзе Давідавым Спасіцель, Які ёсць Хрыстос Гасподзь» (Лк. 2: 10—11).

Узлюбленыя! У мінулым годзе ў епархіях Беларускага Экзархата адбываліся ўрачыстасці ў гонар 1015-годдзя заснавання Праваслаўнай Царквы ў Беларусі. Нам рана падводзіць вынікі, бо мы знаходзімся яшчэ ў самым пачатку вельмі цяжкага шляху аднаўлення Царквы на нашай зямлі ў тым яе значэнні і ў той годнасці, якая запатрабавана шматпакутнай гісторыяй нашага народа.

Але мы бачым, што не дарэмныя нашы намаганні і не марныя спадзяванні, бо за апошнія пятнаццаць гадоў узрасло і цяпер уваходзіць у самастойнае жыццё новае пакаленне нашых суайчыннікаў, якія з маленства далучаны да Святых Хрыстовых Тайнаў і нязменна знаходзяцца ва ўлонні Царквы. На іх ускладаем мы нашы спадзяванні, бо яны не страчаны ні для Бога, ні для людзей, ні для Бацькаўшчыны.

У цяперашні вельмі няпросты час на хрысціянах ляжыць асаблівая адказнасць за стан свайго сэрца і розуму. Мы пакліканы не толькі захоўваць перад абліччам свету нашу веру ў Бога, але і праяўляць глыбіню свайго асабістага даверу да Тварца. Нам трэба не палохацца буйства стыхій свету гэтага, і тым больш забабонаў і пустых страхаў, — а ў любых абставінах бязбоязна жыць і сведчыць пра Госпада нашага Ісуса Хрыста як Спасіцеля свету.



Прыгадаем словы, якія прагучалі ў 1593 годзе з вуснаў дабравернага князя Канстанціна Канстанцінавіча Астрожскага. «Мы не паветра і не вецер сцеражом, — звяртаўся ён да сваіх адзінаверных суайчыннікаў, — але ісцінную веру, трымаючыся яе, захоўваем». Гэты верны сын Праваслаўнай Царквы і сапраўдны герой нашай Бацькаўшчыны ўмеў быць цвёрдым у сваёй веры, у яе абароне і ўмацаванні.

У надыходзячым годзе нам належыць аддаць князю Канстанціну Астрожскаму даніну вечнай і ўдзячнай памяці, бо ўжо чатыры стагоддзі мінула з дня яго спачыну. За гэты час гісторыя нашага народа шмат разоў пацвярджала ісціннасць яго глыбокага перакананя ў тым, што толькі праваслаўная вера бацькоў можа з'яўляцца асноваю для нашай свабоды ад ілжэвучэнняў, для нашай незалежнасці ад стыхій свету гэтага і для нашага ўмацавання ў запаведзях Госпада Ісуса Хрыста.

Сардэчна вітаю з радасным святам Раджджаства Хрыстовага ўсіх хрысціян Беларусі і ўсіх суайчыннікаў, што жывуць за межамі Беларускай зямлі.

Веру, што і ў надыходзячым Навалецці добрасці Божай, паводле слова Псалмапеўца, «Гасподзь дасць сілу народу Свайму, Гасподзь благаславіць народ Свой мірам» (Пс. 28: 11). Амінь.

**ФІЛАРЭТ,**
**Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі,**
**Патрыяршы Экзарх**
**усяе Беларусі.**

*Раджджаство Хрыстова,*
*2007/2008 гг.,*
*Мінск*

## Яшчэ адзін медаль у скарбонку звяздоўцаў

**Як паведамляла ўжо «Звязда», Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 28 снежня падпісаў Указ № 675 «Аб узнагароджанні дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь».**

Учора рэдакцыі стала вядома, што сярод адзначаных медалём Францыска Скарыны ёсць і наш калега — **рэдактар аддзела фотаілюстрацыі «Звязды» Яўген ПЯСЕЦКІ.** Шчыра віншуем Яўгена Віктаравіча з высокай дзяржаўнай узнагародай, зычым далейшага плёну ў працы, рэалізацыі ўсіх творчых планаў і задум, з якімі ўсе ахвотнікі змогуць пазнаёміцца на старонках нашай газеты.

**Звяздоўцы.**

5 студзеня — Дзень работніка сацыяльнай абароны

# «ПЛАНКА» 500 ЗАСТАЕЦЦА РАНЕЙШАЙ

**За апошнія гады ў Беларусі выпрацавана свая мадэль сацыяльнай абароны: апроч традыцыйнай падтрымкі пенсіянераў, інвалідаў і сем'яў з малымі дзецьмі зараз робіцца стаўка на стварэнне ўмоў для эканамічнай актыўнасці насельніцтва. Прычым, як адзначыла падчас сустрэчы з журналістамі з нагоды Дня работніка сацыяльнай абароны намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна, падобная акалічнасць дае свой плён. Калі ў 2000 годзе даходы, ніжэйшыя за адзнаку бюджэту пражытковага мінімуму, мелі 42 працэнты, то ў 2005 годзе — 12,7, пазалетась — 11,1, у трэцім квартале летась — 10 працэнтаў грамадзян краіны.**

### КАЛДАГАВОР СТАНОВІЦЦА ЗАКОНАМ?

Варта нагадаць, што па выніках 2007 года ўзровень сярэдняй зарплаты па Беларусі планаваўся на ўзроўні 340, а па бюджэтнай сферы — 300 долараў у эквіваленце. Пакуль яшчэ канчатковых статыстычных звестак няма, тым не менш, адзначыла Марыяна Шчоткіна, ужо зараз можна сцвярджаць, што гэтыя задачы выкананыя. Як удалося, да слова, выйсці на сярэднія 200 долараў і па традыцыйна праблемнай галіне — сельскай гаспадарцы.

Пры гэтым, заўважаюць у міністэрстве, у абсалютнай большасці выпадкаў выплата заробкаў робіцца не толькі своечасова, але і двойчы ў месяц. Праўда, сітуацыю з разлікамі даводзіцца кантраляваць, аднак менавіта дзякуючы гэтаму летась у параўнанні з 2006 годам колькасць «адхіленняў» ад вызначаных у калектыўных дагаворах тэрмінаў зменшылася на чвэрць.

Тым часам, падкрэсліла Марыяна Шчоткіна, задачы на будучыню застаюцца ранейшымі — да канца 2010 года сярэдні ўзровень аплаты працы па краіне павінен адпавядаць 500 доларам. І, да слова, да гэтага ж часу ў Беларусі мяркуецца скарацiць колькасць шкодных працоўных месцаў на 20 працэнтаў.

### ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ БЕЗ ЗРУХАЎ

Адным з найбольш спрэчных момантаў мінулага года сталася прыняцце Закона «Аб прафесійным пенсійным страхаванні». Закон быў успрыняты неадназначна, але разам з тым у міністэрстве адзначаюць — ён дазваляе адмовіцца ад больш радыкальных змяненняў у пенсійнай сістэме. І ў прыватнасці — ад павелічэння ўзросту выхаду на пенсію. Прынамсі, пакуль такі варыянт не разглядаецца.

Пры гэтым, звярнула ўвагу Марыяна Шчоткіна, у адрозненне ад многіх краін былога СССР у Беларусі захаваліся «шкодныя» Спісы № 1 і № 2, хоць у свой час прапанова скасаваць іх на самай справе была.

### СПЯШАЙСЯ МАРУДНА

І ўсё ж аб пенсіях — гаворка асобная. Прынамсі, таму, што кожны месяц на фінансаванне пенсій накіроўваецца каля 820 млрд рублёў, а агульныя выдаткі на гэтыя мэты адпавядаюць 11 працэнтам ВУП. Такога высокага паказчыка на постсавецкай прасторы проста няма.

Як заўважыла начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Валянціна Каралёва, на працягу мінулага года зыходзячы з росту заробкаў працоўныя пенсіі павялічваліся з 1 верасня і 1 лістапада, плюс да таго, праведзена чатыры індэксацыі мінімальных і сацыяльных пенсій у сувязі са змяненнем бюджэту пражытковага мінімуму. Такім чынам, да новага года сярэдні памер працоўнай пенсіі па ўзросце выйшаў на адзнаку 345,3 тыс. рублёў, або 160 долараў у эквіваленце. У параўнанні з 2006 годам сярэдняя намінальная пенсія па ўзросце павялічылася на 17,8, а сярэдняя рэальная, з улікам змянення цэнаў на тавары і паслугі, пенсія — на 9,1 працэнта. Да таго ж суадносіны сярэдняй мінімальнай пенсіі па ўзросце і бюджэту пражытковага мінімуму пенсіянера склалі 109,7 працэнта.

Паводле слоў Валянціны Каралёвай, далейшы рост пенсій у краіне па-ранейшаму будзе залежаць ад узроўню заробкаў. Задачы тут застаюцца без змяненняў — за гэту «пяцігодку» намінальныя пенсіі павінны ўзрасці ўдвая, а рэальныя пенсіі — у 1,5 раза. І, зазначаюць у міністэрстве, пакуль стан айчыннай эканомікі не прымушае непакоіцца за выкананне гэтых паказчыкаў.

Дзеля справядлівасці — грамадзян, задаволеных памерам уласнай пенсіі, усё ж няшмат. Аднак, лічаць у міністэрстве, справа тут не проста ў фінансавых магчымасцях непасрэдна пенсійнай сістэмы. Ёсць і іншая, не менш важная прычына — практычна ніхто з жыхароў краіны не робіць спроб паўплываць на будучыя даходы ў старасці. Хоць магчымасці для гэтага ёсць — гаворка ідзе аб добраахвотнай «адтэрміноўцы» выхаду на пенсію. Так, адзначыла Валянціна Каралёва, рашэнне працаваць далей і адкласці выхад на пенсію адразу ж пасля дасягнення вызначанага ўзросту на 2 гады прывядзе да павелічэння памеру пенсійных выплат у будучыні амаль напалову.

Апроч таго, зноў-такі амаль ніхто з моладзі і людзей сярэдняга ўзросту не звяртае ўвагі на магчымасць атрымання прыбаўкі дзякуючы дадатковаму добраахвотнаму пенсійнаму страхаванню. Тым часам, таксама не сакрэт — дагаворы дадатковага пенсійнага страхавання маюць большасць работнікаў краін Захаду.

### СТАЖ УЖО НЕ «ЗНІКНЕ»

Яшчэ адной значнай падзеяй мінулага года сталася ўступленне ў сілу Дагавора «Аб супрацоўніцтве ў галіне пенсійнага забеспячэння» паміж Беларуссю і Расіяй. Варта нагадаць, што, паводле гэтага дакумента, кожная з дзвюх дзяржаў робіць выплату пенсіі за стаж, які быў запрацаваны на яе тэрыторыі. І сама па сабе падобная акалічнасць павінна вырашыць праблему «страчаных» перыядаў працоўнай дзейнасці асобаў, якія змяняюць краіну пражывання.

Як паведаміла Валянціна Каралёва, нягледзячы на тое, што пагадненне па выкарыстанні нормаў гэтага дакумента з Расіяй яшчэ не падпісана, дагавор ужо працуе. І, да слова, не выключана, што сёлета аналагічны дагавор аб «экспарце» частак пенсій будзе заключаны з Латвіяй, а ў больш аддаленай перспектыве — і з Азербайджанам.

### ЗА МЯЖУ АБО Ў СТАЛІЦУ?

У студзені—лістападзе мінулага года па дапамогу ў працаўладкаванні ў службы занятасці насельніцтва звярнулася больш за 306 тыс. грамадзян Беларусі, што перавысіла паказчык аналагічнага перыяду пазалетась на 6 працэнтаў. Тым не менш, заўважыў начальнік галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Мікалай Коханаў, узровень зарэгістраванага беспрацоўя ў краіне застаўся на нізкім узроўні — 1 працэнт ад эканамічна актыўнага насельніцтва.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

ISSN 1990 - 763X

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.01.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 150,00 |
| 1 еўра | 3 162,11 |
| 1 латвійскі лат | 4 527,75 |
| 1 літоўскі літ | 915,87 |
| 1 чэшская крона | 120,83 |
| 1 польскі злоты | 876,58 |
| 1 расійскі рубель | 87,61 |
| 1 украінская грыўня | 425,53 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 24,5462 |
| 10 UAH | 48,2357 |
| 1000 BYR | 11,3897 |
| EUR | 35,9332 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 4.01.2008 г.)*

USD ............ 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ПАВЯЛІЧАНЫ ПАМЕРЫ КАМПЕНСАЦЫІ РАСХОДАЎ ПРЫ СЛУЖБОВЫХ КАМАНДЗІРОЎКАХ

**Міністэрства фінансаў Беларусі павялічыла памеры кампенсацыі расходаў пры службовых камандзіроўках.**

У адпаведнасці з пастановай Міністэрства фінансаў ад 21 снежня 2007 года № 197, з 1 студзеня 2008 года расходы складаюць Br15 тыс. за кожны дзень камандзіроўкі. Сутачныя расходы пры аднадзённых службовых камандзіроўках і камандзіроўках у такую мясцовасць, адкуль маецца магчымасць штодня вяртацца да месца жыхарства, — Br7,5 тыс., расходы па найму жылога памяшкання без прадстаўлення пацвярджальных дакументаў — Br4,5 тыс. Указаныя памеры кампенсацыі расходаў для органаў дзяржаўнага кіравання і арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту, уводзяцца ў межах планавых бюджэтных асігнаванняў, зацверджаных на гэтыя мэты.

**Кар. БЕЛТА.**

### ЗАТРЫМАНЫ ПАДАЗРОНЫ Ў ЗАБОЙСТВЕ ШКОЛЬНІЦЫ

**З Лагойскага раёна, дзе з 23 лістапада мінулага года вяліся пошукі вучаніцы другога класа Беларуцкай СШ Ірыны Кужэльнай, прыйшла сумная вестка — сямігадовую дзяўчынку знайшлі нежывой.**

Нагадаем, што з моманту знікнення школьніцы да яе пошукаў былі прыцягнуты, акрамя праваахоўнікаў, таксама і ваеннаслужачыя, леснікі, паляўнічыя, апрацоўвалася тэрыторыя не толькі Лагойскага раёна, але і Мінскай вобласці, сталіцы. На жаль, спадзяванні на тое, што дзяўчынка зможа сама раскрыць усе акалічнасці свайго знікнення, не спраўдзіліся. Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» часова выконваючы абавязкі начальніка ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі Алег Слепчанка, супрацоўнікі крымінальнага вышуку знайшлі цела школьніцы за шэсць кіламетраў ад пасёлка, дзе яна пражывала. Няшчаснае дзіця ляжала пад бесгаспадарчым будаўнічым вагончыкам, які стаяў на ўскрайку ляснога масіву непадалёк ад дачнага пасёлка «Лясное 90». Папярэдні агляд цела не выклікаў у сышчыкаў сумненняў у тым, што гэта Ірына. Няма падстаў у праваахоўнікаў сумнявацца і ў тым, што дзяўчынка загінула гвалтоўнай смерцю. Аднак, як падкрэслівае Алег Слепчанка, сапраўдныя прычыны гібелі дзіцяці стануць вядомымі пасля правядзення спецыяльнай экспертызы. Алег Слепчанка таксама паведаміў, што па падазрэнні ва ўчыненні гэтага жорсткага забойства затрыманы 29-гадовы мінчанін. Зараз праваахоўнікамі ўстанаўліваюцца матывы і акалічнасці гэтага злачынства, з затрыманым праводзяцца следчыя дзеянні.

**Ігар ГРЫШЫН.**

белагропромбанк

традиции будущего

**ПОБЕДИТЕЛЬ КОНКУРСА «БРЭНД ГОДА 2006»**

**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»**

сообщает, что 14 января 2008 года проводится внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме.

220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 3 января 2008 года.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы и отделения по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования заполняются и представляются не позднее 11 января 2008 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 23 января 2008 года.

**Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 228 53 03.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2007 г. № 2, УНП 100693551

## Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай і Мінскай абласцям прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг

У сувязі з 70-годдзем з дня ўтварэння і за асаблівыя дасягненні ў гаспадарчым развіцці Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай і Мінскай абласцям прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Адпаведныя ўказы былі падпісаны Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам 3 студзеня.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

**Кооператив по обслуживанию индивидуальных гаражей «Восток-1» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона) проводят открытый аукцион**

по продаже здания специализированного автомобильного транспорта (бокс для хранения автомобилей), расположенного в г. Минске по ул. Калиновского, д. 119 (инвентарный номер 500/С-44669, общая площадь – 53,1 кв.м). Земельный участок площадью 2,2459 га предоставлен во временное пользование для эксплуатации и обслуживания гаражей по адресу: г. Минск, ул. Калиновского, 119 (решение Мингорисполкома от 24.02.2005 № 258 п. 13).

Начальная цена – 57 349 461 белорусский рубль без учета НДС.

Условие продажи: победитель аукциона обязуется вступить в кооператив по обслуживанию индивидуальных гаражей «Восток-1» в срок, установленный в договоре купли-продажи.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены объекта (5 700 000 белорусских рублей) и плата за участие в аукционе в размере 4 базовых величин (140 000 белорусских рублей) перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем заключается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. ***Аукцион состоится 06 февраля 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.*** Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 05 февраля 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6. Порядок подачи заявлений на участие в аукционе указан в условиях проведения аукциона.

**Телефоны для справок: 227-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости»; 267-97-33 – кооператив «Восток-1».**

УП «Минский городской центр недвижимости». УНП 190398583.

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Слуцком райисполкоме, проводит открытый аукцион**

по продаже обращенного в доход государства: здание склада ГСМ с заправочной (об. пл. 85,1 кв. м), здание склада запчастей (об. пл. 81,2 кв. м), эстакада для ремонта автомобилей, расположенные по адресу: г. Слуцк, ул. Гагарина, 32. Начальная цена — 35 300 000 белорусских рублей. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Объекты продаются без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 12.02.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 11.02.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. **Контактный телефон (8017) 2246134. Сайт в Интернете: www.rlt.by**

УНП 690324015.

# ПАД НАВАГОДНІ ФЕЕРВЕРК

**У навагоднюю ноч у радзільным аддзяленні 3-й гарадской клінічнай бальніцы нарадзіўся маленькі Яраслаў. Гэта быў лепшы падарунак маладым бацькам.**

Нарадзіўся хлопчык вагой 3,5 кілаграма і ростам 53 сантыметры. Яго першы крык быў чутны ўжо ў гадзіну трыццаць, якраз у гэты момант стрэліў першы снарад чароўнага навагодняга феерверка. Як ведаць, можа менавіта таму сёлетні салют атрымаўся незвычайна прыгожым.

— Я не збіралася ў радзільню ў навагоднюю ноч, — расказвае 22-гадовая Дыяна Клянкоўская, маці «зорнага хлопчыка». — Я ўсю цяжарнасць жартавала з мужам, маўляў, сынок народзіцца на Новы год, але ўрачы прызначылі мне тэрмін — 4 студзеня. Яшчэ а 17-й гадзіне 31 снежня мы з мужам куплялі падарункі родным. Мне пачынаў трошкі балець жывот. Дома я ўжо зразумела, што гэта сур'ёзна. А дзевятай гадзіне вечара за мной прыехала «хуткая». Потым, калі муж мяне віншаваў, ён са смехам гаварыў: «Ну што, нажартавалася!».

Калі ўся краіна падымала келіхі і прамаўляла тосты, Дыяна пад наглядам уважлівага і ласкавага медперсаналу рабіла самую адказную і важную ў гэту ноч справу — нараджала сына. Апошняе, што яна запомніла перад надыходам Новага года — падзяку Прэзідэнта жанчынам за народжаных дзяцей.

Беларускі быццам дамовіліся на словы адказаць справай: за суткі з раніцы 31 снежня і па раніцу 1 студзеня ў Мінску было зарэгістравана 23 выклікі «хуткай» з нагоды родаў. У звычайныя дні «103» выязджае для будучых мам менш за 20 разоў.

Сёння сям'я Клянкоўскіх збярэцца ў поўным складзе. Першае ў жыцці Яраслава Раджджаство Хрыстова яны будуць святкаваць разам.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ПЛАСТИКОВЫЕ КАРТОЧКИ — ИЗМЕНЕНИЯ К ЛУЧШЕМУ

Как быстро все меняется: еще вчера наши родители стояли в очередях за пенсией, носили толстые кошельки, хранили деньги в шкатулках, занимали друг у друга на покупку «холодильника», а сегодня?

На современном этапе развития банковской системы в Республике Беларусь сервис по обслуживанию клиентов приобретает новые формы. Развитие системы безналичных расчетов движется в направлении сокращения наличного денежного оборота и увеличения спектра услуг, предоставляемых держателям банковских карточек. Карточки стали полноценным платежным инструментом, обеспечивающим доступ к средствам на карт-счетах и позволяющим безналичным путем оплачивать товары и услуги, получать наличные денежные средства, кредиты и осуществлять электронные платежи через Интернет.

Лучшим подтверждением того, что люди все с большим доверием относятся к банковским сервисам, служит постоянный прирост карточек в обращении. Количество карточек международных и внутренних платежных систем увеличилось на 16 % по сравнению с началом 2007 года и достигло почти 4,5 млн штук на 1 октября.

Для поддержания высокого уровня сервиса, направленного на обслуживание карточек, банки инвестируют средства в создание сети инфокиосков и банкоматов, терминалов в организациях торговли и сервиса, предоставляют дополнительные инструменты управления средствами на карт-счетах: SMS-банкинг и Интернет-банкинг.

*А что ожидать в будущем от банковской системы в плане пластиковых карточек и дополнительных сервисов?* **Рассказывает Елена КИШКУРНО, заместитель начальника управления организации и развития платежных систем Главного управления платежной системы Национального банка Республики Беларусь:**

Правительством Республики Беларусь и Национальным банком разработаны мероприятия, направленные на развитие системы безналичных расчетов с использованием банковских пластиковых карточек, а также программно-технической инфраструктуры, позволяющей применять данный платежный инструмент для осуществления безналичных платежей. Проводится работа по реализации Государственной программы развития технической инфраструктуры на 2006—2010 годы, обеспечивающей использование банковских пластиковых карточек, а также Плана мероприятий по переходу сферы торговли и услуг на безналичный расчет с организацией системы стимулирования установления терминального оборудования и безналичных расчетов с помощью пластиковых карточек на 2006—2010 годы.

В рамках реализации упомянутых документов к 2011 году доля безналичного денежного оборота в сфере торговли и услуг, в том числе с использованием банковских пластиковых карточек, должна быть доведена до 30 %. Необходимо организовать производство основных компонентов программно-технической инфраструктуры, направленной на использование банковских и иных пластиковых карточек, внедрить международные стандарты EMV.

В итоге к 2010 году количество платежно-справочных терминалов самообслуживания — инфокиосков для проведения безналичных платежей с использованием карточек должно составить 2723 единицы. Планируется увеличить количество платежных терминалов в организациях торговли (сервиса) к концу реализации Государственной программы на 5814 единиц, в банках — на 3317 единиц.

По состоянию на 1 октября 2007 года банками введено в эксплуатацию 1202 инфокиоска. В организациях торговли банками установлено 8098 платежных терминалов, проводятся различные рекламные акции, направленные на популяризацию карточек и информирование населения о преимуществах их использования для безналичных расчетов.

В основном вся программно-техническая инфраструктура для безналичных расчетов с использованием банковских пластиковых карточек, функционирующая в республике, (банкоматы, инфокиоски, платежные терминалы и др.) приобретена и установлена за счет средств банков. Необходимо отметить, что пока организации торговли не проявляют должной заинтересованности в развитии безналичных расчетов за товары с использованием карточек. Вместе с тем организации торговли и сервиса в большинстве случаев получили возможность активного внедрения карточек в платежный оборот.

Работа в направлении развития системы безналичных расчетов с использованием карточек должна продолжаться при активном участии всех заинтересованных с тем, чтобы население страны имело возможность использовать карточку не только для получения наличных, но, прежде всего, для оплаты товаров и услуг.

Количество банкоматов в Республике Беларусь с начала 2007 года увеличилось на 15 % и составило 1772 единицы, в частности, по городу Минску их насчитывается более 500, а прирост составил 11 %.

Одним из лидеров по количеству установленных банкоматов в Республике Беларусь и уровню предоставляемого сервиса держателям пластиковых карточек является БПС-Банк. **Мы попросили рассказать о возможностях пластиковых карточек БПС-Банка Вадима КОЗЛОВА, начальника технологического управления департамента банковских карточек ОАО «БПС-Банк»:**

Услуги по пластиковым карточкам — одно из наиболее приоритетных и динамично развивающихся направлений деятельности банка. Разработано более 20 категорий карточек в белорусских рублях, долларах США и евро — от недорогих в обслуживании «электронных» карточек Visa Electron и Maestro до престижных «золотых» карточек Visa Gold и MasterCard Gold. «Электронные» карточки Visa Electron и Maestro прекрасно подходят для клиентов, впервые начинающих пользоваться пластиковой карточкой. Как правило, они оформляются к карт-счету в белорусских рублях и используются для распоряжения своей заработной платой или пенсией. Несмотря на недорогое обслуживание, держатель такой карточки имеет широкие возможности по ее использованию.

Некоторые думают, что такой карточкой можно пользоваться только в Республике Беларусь. В действительности карточку, на которую перечисляется зарплата или пенсия, можно использовать практически в любой стране мира. Для этого в заявлении на получение карточки достаточно предусмотреть возможность совершения операций за рубежом.

С помощью карточки можно расплачиваться в магазинах, кафе, на заправках и т.д., получать наличные деньги в любое время суток в удобном для клиента месте, оплачивать коммунальные услуги, электроэнергию, мобильную и стационарную телефонную связь, услуги кабельного телевидения и Интернет-провайдеров, пополнять свои вклады, текущие счета и электронные кошельки, погашать кредиты. В устройствах самообслуживания ОАО «БПС-Банк» можно оплачивать более 300 услуг, предоставляемых организациями в различных регионах республики. Это можно сделать в банкоматах и инфокиосках банка, с мобильного телефона или домашнего компьютера. Ознакомиться с данными услугами можно на сайте банка www.bpsb.by или в любом подразделении ОАО «БПС-Банк».

ОАО «БПС-Банк» выпускает не только массовые «электронные» пластиковые карточки. Наши «классические» карточки Visa Classic и MasterCard Standard идеально подходят для тех, кто много времени отдает деловым поездкам и часто путешествует. Сотни тысяч банкоматов и миллионы торговых точек принимают к обслуживанию карточки Visa Classic и MasterCard Standard. «Классические» карточки имеют все возможности «электронных» карточек. Кроме того, они принимаются в качестве гарантии при бронировании гостиниц, аренде автомобилей, а также для оплаты товаров и услуг в сети Интернет, по телефону или при заказе по почте.

«Золотые» карточки Visa Gold и MasterCard Gold — это престижно. Они подчеркивают высокий социальный статус своего владельца и являются гарантией особого внимания к нему. В дополнение к преимуществам «классических» карточек, держатели карточек Visa Gold и MasterCard Gold пользуются привилегиями, предоставляемыми международными платежными системами Visa и MasterCard.

Добавлю, что карточки Visa Classic и Visa Gold ОАО «БПС-Банк» — это карточки нового поколения, на которых совмещены традиционная магнитная полоса и микропроцессорный модуль, реализующий современные технологии обеспечения безопасности в платежных системах.

Оформить карточку можно в любом подразделении нашего банка, где клиенту предложат заполнить заявление на выдачу карточки и заключить договор карт-счета. Изготовление карточки занимает несколько дней. Также клиент может оформить к карт-счету дополнительные карточки себе или своим близким и установить ограничение на расход средств по каждой дополнительной карточке.

Сейчас многие банки республики выдают потребительские кредиты на пластиковые карточки. ОАО «БПС-Банк» для предоставления кредита по карточке в основном использует овердрафтное кредитование. Если у вас есть пластиковая карточка нашего банка с открытым овердрафтом, Вы можете в любое время совершать покупки, оплачивать услуги и получать наличные в кредит в пределах предоставленного кредитного лимита. При этом лимит является возобновляемым — это означает, что после того, как вы вернули банку какую-то сумму, ее можно опять взять у банка в кредит. И так неограниченное количество раз!

В настоящее время банком эмитировано более 570 тыс. карточек. Нам очень приятно, что так много людей сделали выбор в пользу качества, новейших технологий и выгодных тарифов. Мы стремимся не только увеличивать количество банкоматов и инфокиосков, расширять спектр услуг, но и обеспечить высокий уровень обслуживания, заинтересовать наших клиентов в безналичных расчетах по карточкам.

Банковские карточки — это не только средство платежа в магазине, банкомате и инфокиоске. Это инструмент, позволяющий его владельцу совершать безналичные платежи вовсе не сходя с места. **О возможностях, которые может получить пользователь Интернет-банка, рассказывает Олег ГИРИН, заместитель начальника управления неторговых операций Минского транзитного банка.**

Мы убеждены, что беларусы уже давно готовы к безналичным расчетам, это намного удобнее, безопаснее и быстрее, чем наличные платежи. В мировой практике безналичные производятся с помощью систем электронных платежей для физических лиц. Различные системы при этом могут по своему функциональному наполнению отличаться достаточно серьезно. В дополнение к перечню стандартных платежей (коммунальные, услуги мобильных операторов, Интернет-провайдеров, погашение кредитов) клиент может получить возможность оплачивать любые товары и услуги (так называемые произвольные платежи в пользу юридических лиц), пополнять электронные кошельки и многое другое.

Также банковские системы дистанционных платежей предлагают дополнительные сервисные опции, облегчающие управление своими финансами. Примером может служить возможность автоматической настройки на регулярные платежи, т.е. вы легко сможете «запрограммировать» систему осуществления конкретного платежа на конкретную сумму в указанный срок — и больше никогда не вспоминать о том, что вы должны, условно, 15-го числа каждого месяца платить за квартиру.

И естественно, один из самых важных вопросов, которому все банки уделяют повышенное внимание — обеспечение безопасности систем Интернет-банкинга. В системе «Мой Банк» от МТБанка реализована, например, 4-уровневая система защиты денежных средств и конфиденциальности информации владельца.

Еще одним преимуществом для клиентов — физических лиц, активно использующих безналичные формы расчетов, является участие в различных стимулирующих мероприятиях и розыгрышах, периодически проводимых белорусскими банками. Например, в настоящее время наши клиенты имеют приятную возможность принять участие в рекламной акции Минского транзитного банка «Время побеждать». Пользователи системы Интернет-банкинга «Мой банк», а также все обладатели пластиковых карточек МТБанка могут стать владельцами нового телевизора Philips 32 PFL 532, а также выиграть эксклюзивный приз — недельный тур в Пекин с посещением Олимпиады-2008 в августе нынешнего года.

Теперь ни у кого не должны возникать сомнения в том, что банки стараются помочь нам чувствовать себя свободнее и мобильнее в современном мире.

Нужно лишь быть готовыми к этим изменениям.

ЗАО «Минский транзитный банк».
Лицензия НБРБ № 13 на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 г., УНН 100394906
Свидетельство № 911 о государственной регистрации правил проведения рекламной игры от 7 декабря 2007 года.
Сроки проведения рекламной игры: с 8 декабря 2007 года по 1 августа 2008 года.
ОАО «БПС-банк»
Лицензия НБРБ № 4 на осуществление банковской деятельности от 11.07.2007 г., УНП 100219673

**Закон Рэспублікі Беларусь**

## Аб унясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб гарантыях па сацыяльнай абароне дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама асобаў з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў»

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 12 снежня 2007 года*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 20 снежня 2007 года*

**Артыкул 1.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 21 снежня 2005 года «Аб гарантыях па сацыяльнай абароне дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама асобаў з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 2, 2/1170) наступныя змяненні:

1. Пункт 3 артыкула 9 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«3. Расходы на аплату за карыстанне жылымі памяшканнямі, тэхнічнае абслугоўванне, аплату камунальных паслуг (гарачае і халоднае водазабеспячэнне, каналізацыя, газ, электрычная і цеплавая энергія, карыстанне ліфтамі, вываз і абясшкоджванне цвёрдых бытавых адходаў), аплату паліва (тым, хто пражывае ў дамах без цэнтральнага ацяплення), звязаныя з утрыманнем дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, знаходзяцца ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу, апякунскіх сем'ях і прыёмных сем'ях, падлягаюць кампенсаванню грамадзянам, на выхаванні якіх яны знаходзяцца, за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў.

Гэтыя расходы вызначаюцца зыходзячы з устаноўленых заканадаўствам платы за карыстанне жылымі памяшканнямі, тэхнічнае абслугоўванне, цэнаў і тарыфаў на камунальныя паслугі, а таксама фактычнага спажывання ўказанымі дзецьмі гэтых паслуг, якое падлічваецца на падставе ўстаноўленых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі нормаў (нарматываў) іх спажывання або паказанняў індывідуальных або групавых прыбораў уліку, але не вышэй за названыя нормы (нарматывы), а ў дачыненні да паліва — зыходзячы з яго фактычнага спажывання ўказанымі дзецьмі, якое падлічваецца на падставе нормаў, устаноўленых заканадаўствам для продажу насельніцтву. Пры гэтым кампенсаванне сумаў, выплачаных за карыстанне жылым памяшканнем, яго тэхнічнае абслугоўванне, а таксама спажытую цеплавую энергію, ажыццяўляецца ў межах 20 квадратных метраў агульнай плошчы жылога памяшкання на адно дзіця, якое знаходзіцца ў дзіцячым доме сямейнага тыпу, апякунскай сям'і або прыёмнай сям'і.

Расходы на аплату за карыстанне кватэрным тэлефонам (акрамя міжгародніх і міжнародных размоў), бытавымі паслугамі (паслугі пральняў, цырульняў, па рамонце абутку), звязаныя з утрыманнем дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, знаходзяцца ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу, апякунскіх сем'ях і прыёмных сем'ях, падлягаюць кампенсаванню грамадзянам, на выхаванні якіх яны знаходзяцца, за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў зыходзячы з нормаў, устаноўленых Урадам Рэспублікі Беларусь.».

2. У частцы першай пункта 2 артыкула 10 словы «за імі не захавалася жылое памяшканне або калі яны не могуць быць па іншых прычынах заселены ў жылое памяшканне, з якога выбылі» замяніць словамі «яны не маюць ва ўласнасці жылога памяшкання або ў карыстанні жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду або не могуць быць заселены ў жылое памяшканне дзяржаўнага жыллёвага фонду, з якога выбылі, або пры засяленні ў гэта жылое памяшканне яны будуць мець патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, або ў іншых выпадках, калі немагчымасць засялення ў такое жылое памяшканне ўстаноўлена мясцовым выканаўчым і распарадчым органам па месцы знаходжання гэтага жылога памяшкання».

3. Артыкул 12 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 12. Гарантыі права на жыллё**

1. Дзецям-сіротам, дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама асобам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, гарантуецца права на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду, ільготных крэдытаў, аднаразовых бязвыплатных субсідый і іншых формаў дзяржаўнай падтрымкі для будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылога памяшкання ў адпаведнасці з заканадаўствам, калі яны не маюць ва ўласнасці жылога памяшкання або ў карыстанні жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду або не могуць быць заселены ў жылое памяшканне дзяржаўнага жыллёвага фонду, з якога выбылі, або пры ўсяленні ў гэта жылое памяшканне яны будуць мець патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, або ў іншых выпадках, калі немагчымасць засялення ў такое жылое памяшканне ўстаноўлена мясцовым выканаўчым і распарадчым органам па месцы знаходжання гэтага жылога памяшкання.

Дзецям-сіротам, дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў, у дачыненні да якіх прынята рашэнне аб эмансіпацыі або якія ўступілі ў шлюб, а таксама асобам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, жылыя памяшканні сацыяльнага карыстання дзяржаўнага жыллёвага фонду прадастаўляюцца на працягу двух месяцаў пасля дасягнення імі паўналецця або па іх жаданні на працягу двух месяцаў пасля спынення навучання ва ўстановах, што забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, пасля заканчэння тэрміновай ваеннай службы.

Гарантыі права на жыллё, прадугледжаныя часткай першай гэтага пункта, прадастаўляюцца дзецям-сіротам, дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама асобам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па месцы першапачатковага набыцця статуса дзяцей-сірот або статуса дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, або па месцы прадастаўлення ім першага працоўнага месца.

2. Дзецям-сіротам, дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама асобам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, гарантуецца захаванне права ўласнасці на жылое памяшканне або права карыстання жылым памяшканнем дзяржаўнага жыллёвага фонду, з якога яны выбылі.

На працягу двух месяцаў пасля набыцця дзецьмі-сіротамі і дзецьмі, якія засталіся без апекі бацькоў, дзеяздольнасці ў поўным аб'ёме або па іх жаданні на працягу двух месяцаў пасля спынення навучання ва ўстановах, што забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, пасля заканчэння тэрміновай ваеннай службы мясцовы выканаўчы і распарадчы орган (іншы дзяржаўны орган, іншая дзяржаўная арганізацыя, у гаспадарчым распараджэнні або аператыўным кіраванні якіх знаходзяцца жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду) абавязаны прадаставіць ім раней займаемае жылое памяшканне дзяржаўнага жыллёвага фонду, якое адпавядае ўстаноўленым для пражывання санітарным і тэхнічным патрабаванням. Калі яны не могуць быць заселены ў жылое памяшканне дзяржаўнага жыллёвага фонду, з якога выбылі, або пры засяленні ў гэта жылое памяшканне яны будуць мець патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, або ў іншых выпадках, калі немагчымасць засялення ў такое жылое памяшканне ўстаноўлена мясцовым выканаўчым і распарадчым органам па месцы знаходжання гэтага жылога памяшкання, па жаданні ўказаных асобаў ім прадастаўляецца жылое памяшканне дзяржаўнага жыллёвага фонду, якое адпавядае па агульнай плошчы нормам прадастаўлення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду і ўстаноўленым для пражывання санітарным і тэхнічным патрабаванням.».

**Артыкул 2.** Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Закона:

прывесці рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам;

забяспечыць прывядзенне рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, якія падпарадкаваны Ураду Рэспублікі Беларусь, іх нарматыўных прававых актаў у адпаведнасць з гэтым Законам;

прыняць іншыя меры па рэалізацыі гэтага Закона.

**Артыкул 3.** Гэты Закон уступае ў сілу з 1 студзеня 2008 года, за выключэннем гэтага артыкула і артыкула 2, якія ўступаюць у сілу з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА**
27 снежня 2007 года, г. Мінск.
№ 305—З

### *Віншуем з юбілеем*

*Нашаму калегу, былому «звяздоўцу», а сёння галоўнаму рэдактару газеты «Мінская праўда» **М.А. ШЛОМЕ** споўнілася 60 гадоў.*

*Калектыў нашай рэдакцыі шчыра віншуе свайго ўдалага і таленавітага выхаванца Мікалая Аляксандравіча з гэтай прыгожай датай, зычыць яму моцнага здароўя, творчага даўгалецця, цікавых знаёмстваў і прыемных адкрыццяў на журналісцкіх сцежках, новых глыбокіх пачуццяў і духоўных узлётаў, бадзёрасці і няўрымслівасці думкі.*

**Звяздоўцы.**

## Аляксею Жыгалковічу за перамогу ў дзіцячым конкурсе «Еўрабачанне-2007» аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта Беларусі

За высокія дасягненні ў прафесійнай дзейнасці, значны асабісты ўклад у падрыхтоўку і забеспячэнне паспяховага ўдзелу беларускіх выканаўцаў у дзіцячых конкурсах песні «Еўрабачанне» ордэнам Францыска Скарыны ўзнагароджаны старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Аляксандр Зімоўскі, медалём Францыска Скарыны — выканаўчы прадзюсар прадзюсарскай групы галоўнай дырэкцыі тэлеканала «Лад» Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Людміла Барадзіна і першы намеснік міністра культуры Уладзімір Рылатка.

Ганаровае званне «Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь» прысвоена намесніку старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Юрыю Азаронку. Адпаведны ўказ 31 снежня 2007 года падпісаў кіраўнік дзяржавы.

За высокае выканальніцкае майстэрства і перамогу ў дзіцячым конкурсе песні «Еўрабачанне-2007» распараджэннем Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена Аляксею Жыгалковічу.

У ліку тых, хто таксама ўдастоены Падзякі Прэзідэнта, — выкладчык па вакалу Вольга Вронская, харэограф Аляксандр Мяжэнны, дырэктар — мастацкі кіраўнік Маладзёжнага тэатра эстрады Васіль Раінчык.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## «ПЛАНКА» 500...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Пры гэтым напружанне зменшылася на рынку працы 87 «вясковых» раёнаў, а ў астатніх сітуацыя стабілізавалася.

Што да планаў на 2008 год, то ўзровень беспрацоўя павінен аказацца ў межах 1,2—1,4 працэнта. Да таго ж такі паказчык плануецца ўтрымаць з улікам магчымага павелічэння колькасці зваротаў з боку індывідуальных прадпрымальнікаў і іх наёмных работнікаў.

Праўда, адначасова выпадае казаць і аб некаторых праблемах. Адна з іх — уладкаванне інвалідаў. Адпаведна, сёлета плануецца павялічыць выдаткі на стварэнне новых месцаў менавіта для гэтай катэгорыі, асабліва калі ўзяць пад увагу, што менавіта людзі з абмежаванымі магчымасцямі могуць стаць па-сапраўднаму важкім рэзервам для росту колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва Беларусі ў цэлым.

Не менш складанай тэмай з'яўляецца дэфіцыт высокакваліфікаваных спецыялістаў і перш-наперш — у будаўнічай галіне. Таму застаецца вітаць рашэнне Мінгарвыканкама аб зняцці дадатковых умоў для ўладкавання ў сталіцы жыхароў іншых рэгіёнаў. Як мяркуюць у міністэрстве, такі крок шмат у чым спыніць ад'езды кваліфікаваных кадраў з правінцыі за мяжу.

Паводле даных міністэрства, у краіне налічваецца амаль 2,5 млн пенсіянераў, 512 тыс. інвалідаў, 60 тыс. ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, каля 12 тысяч інвалідаў вайны, 154 тыс. адзінокіх пенсіянераў і 560 тыс. пенсіянераў, што пражываюць асобна ад працаздольных сваякоў, каля 360 тыс. няпоўных сем'яў. Сапраўды, частка з гэтых людзей (асабліва з псіхічнымі захворваннямі) можа атрымаць дапамогу толькі ў стацыянарных дамах-інтэрнатах, таму, да прыкладу, летась у краіне вялася рэканструкцыя адразу 13 аб'ектаў сацыяльнага абслугоўвання.

Разам з тым гэты варыянт падтрымкі становіцца далёка не галоўным. Перавага аддаецца дапамозе «па месцы жыхарства» — праз тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. З 2004 года ў Беларусі працуе 156 падобных устаноў, прычым, як чакаецца, да 2010 года карыстацца паслугамі дома змогуць жыхары ўсіх, у тым ліку невялікіх і аддаленых населеных пунктаў. І не апошнюю ролю тут павінна адыграць стварэнне сацыяльных пунктаў за межамі райцэнтраў. Плюс да таго, цэнтры прапануюць новыя віды падтрымкі. На сёння практычна паўсюль можна скарыстацца паслугамі сядзелкі, а ў 22 раёнах краіны створаны гаспадарчыя брыгады — за невялікую плату такія брыгады займаюцца нарыхтоўкай паліва, рамонтамі памяшканняў, платоў, печак, дапамагаюць апрацоўваць прысядзібныя ўчасткі.

**Сяргей ГРЫБ.**

## У ГОНАР УСІХ СВЯТЫХ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

Вялікае свята Ражджаства Хрыстова жыхары новых мікрараёнаў Заслаўя адзначаць у царкве Усіх Святых зямлі беларускай. Пятнаццаць гадоў стаяў храм без малітваў і нарэшце адкрыўся. Яшчэ шмат сілаў і сродкаў патрэбна, каб давесці збудаванне да ладу. Але малады святар айцец Аляксандр Самуйлаў упэўнены: дзякуючы шчырым малітвам і дапамозе прыхаджан храм заззяе хутка ва ўсёй прыгажосці.

**Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.**





**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях Новікаву Анатолію Мікалаевічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю БРАТА.**

**Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае глыбокае спачуванне старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Новікаву Анатолію Мікалаевічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю БРАТА.**

ОАО «Паритетбанк» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона) повторно проводят открытый аукцион

**по продаже помещений транспортного назначения (машиномест) в подземной гостевой автостоянке, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 9/3.**

| Номер лота | Номер машиноместа | Общая площадь, кв. м | Начальная цена, бел. рубли | Сумма задатка, бел. рубли |
|---|---|---|---|---|
| 4. | 4. | 11.9 | 8 499 992 | 849 999 |
| 5. | 5. | 11.9 | 8 499 992 | 849 999 |
| 6. | 6. | 12.0 | 8 571 420 | 857 142 |
| 7. | 7. | 12.0 | 8 571 420 | 857 142 |
| 9. | 13. | 12.2 | 8 714 277 | 871 428 |
| 11. | 17. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 12. | 20. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 13. | 21. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 14. | 22. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 15. | 27. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 16. | 28. | 12.5 | 8 928 563 | 892 856 |
| 17. | 29. | 11.7 | 8 357 135 | 835 714 |
| 18. | 30. | 11.7 | 8 357 135 | 835 714 |
| 19. | 37. | 9.6 | 6 857 136 | 685 714 |
| 23. | 41. | 9.6 | 6 857 136 | 685 714 |
| 26. | 44. | 9.6 | 6 857 136 | 685 714 |
| 27. | 45. | 10.6 | 7 571 421 | 757 142 |
| 28. | 46. | 10.2 | 7 285 707 | 728 571 |

Начальная цена каждого лота указана без учета НДС.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены лота и плата за участие в аукционе в размере 4 базовых величин (140 000 белорусских рублей) перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» №3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем подписывается в течение 3 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 5 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. ***Аукцион состоится 16 января 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.*** Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 15 января 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Порядок подачи заявлений на участие в аукционе указан в условиях проведения аукциона. Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 06.12.2007.

**Телефоны для справок:**
**227 48 36, 227 40 22 –** УП «Минский городской центр недвижимости»

УНП 190398583.

**ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ ОАО «БРАНДКО»**
**УСЛОВИЯ ПРЕДЛОЖЕНИЯ:**

**Покупатель** — Открытое акционерное общество «Брандко», РБ, г. Минск, ул. Центральная, 46.
**Эмитент акций** — ОАО «Брандко» в ЕГР № 800002642.
**Количество акций к приобретению** — 56 штук.
**Цена приобретения** — 383 929 белорусских рублей за одну акцию (цена приобретения является обязательной для всех предложенных к приобретению акций).

УНП 800002642.

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Борисовском райисполкоме проводят открытый аукцион по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимости:**

| № лота | Наименование объекта | Общ. пл., кв.м | Местонахождение | Начальная цена, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | склад-навес | 1625,3 | г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36 | 122 400 000 |
| 2 | пристройка к прирельсовому складу хранения лаков и красок | 221,2 | | 49 700 000 |
| 3 | навес деревянный для складирования ящиков | 101,8 | | 6 100 000 |
| 4 | гараж на 3 бокса | 163,4 | Борисовский р-н, д. Лошница, ул. Рабочая, 1 | 29 200 000 |
| 5 | склад готовой продукции | 149,4 | | 28 000 000 |

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объекты осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Объекты продаются без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 05.02.2008 г. в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 04.02.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. **Контактные телефоны: (8017) 2246134, (80177) 739327. Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион**

по продаже обращенного в доход государства 4-ого этажа (общ. пл. 2321,1 кв.м) 4-этажного производственного здания, расположенного по адресу: г. Борисов, ул. Даумана, 78. Начальная цена снижена на 10 % и составляет 437 968 584 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 01.12.2007 г. Аукцион состоится 22.01.2008 г. в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21.01.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. **Контактные телефоны: (8017) 2246134, (80177) 739327. Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион**

по продаже обращенного в доход государства гаража № 153 общ. пл. 52, кв.м, расположенного: г. Борисов, ул. 50 лет БССР. Начальная цена снижена на 10 % и составляет 8 719 110 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 16.11.2007 г. Аукцион состоится 22.01.2008 г. в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21.01.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. **Контактные телефоны: (8017) 2246134, (80177) 739327. Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион**

по продаже зданий и сооружений, расположенных по адресу: г. Марьина Горка, ул. Восточная, 8, в том числе: склад (258,6 кв.м), склад ГСМ (15,2 кв.м), баня (805,6 кв.м), гараж (254,9 кв.м), проходная (14,4 кв.м), прачечная (871,9 кв.м), забор железобетонный (498 п.м), кабель силовой электрический, котел паровой Е/9/1 — 3 ед., резервуар — 2 ед., сеть водопроводная, сеть канализаций, коллекторы. Пл. зем. уч. 1,1543 га. Начальная цена снижена на 20 % и составляет 507 000 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.10.2007 г. Аукцион состоится 22.01.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21.01.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны: (8017) 2246134, 3850204, 2810090 Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион**

по продаже обращенного в доход государства здания прирельсового склада (общ. пл. 424,3 кв.м), расположенного: г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36. Нач. цена снижена на 20 % — 82 567 100 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.09.2007 г. Аукцион состоится 22.01.2008 г. в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21.01.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. **Контактные телефоны: (8017) 2246134, (80177) 739327. Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

5 СТУДЗЕНЯ 2008 г. СУБОТА
№ 1 (15504)

# Насустрач цудам



***Ужо не першы раз Узорны тэатр песні і танца «Хвілінка» Палаца культуры мінскага аўтазавода падарыў дзеткам і іх бацькам цудоўную навагоднюю казку з удзелам зорак беларускай эстрады — Вольгі Плотнікавай, Паліны Смолавай, Юліяны, гуртоў «Ванільнае неба», «Топлес», «Пінкод» і іншыя.***

**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

## Падарункі для апёкавага аддзялення

У межах рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» Беларускі дзіцячы фонд працягвае рэалізацыю сваіх дабрачынных мерапрыемстваў — «Нашы сэрцы — хворым дзецям».

Актывісты БДФ разам з прадстаўнікамі ЗП «Цэптар—Інтэрнацыянал» уручылі дзіцячаму апёкаваму аддзяленню мінскай Гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі лямпу «Біяптрон», якая валодае моцным антысептычным дзеяннем, спрыяе зажыўленню ранаў. Каля 30 дзяцей, якія знаходзіліся ў гэты момант у апёкавым аддзяленні, пабачылі тэатралізаваны паказ і атрымалі салодкія падарункі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**



# «Баявое хрышчэнне»

**Пра гэты ўчынак дзевяцікласніка Сяргея Яновіча з Астраўца некалькі месяцаў таму напісалі ў газетах. У «Астравецкай праўдзе» Сяргожу была надрукавана падзяка, а бацькі і сябры да гэтага часу расказваюць пра тое, як смелы хлопчык выратаваў ад пажару трохпавярховы дом...**

Каб зразумець, чаму Сяргей у экстрэмальнай сітуацыі не спалохаўся і паступіў правільна, трэба ведаць пра яго.

З дзяцінства Сяргея прыцягвае работа пажарных і выратавальнікаў: шмат разоў хлопчык бачыў па тэлевізары, як гэтыя бясстрашныя людзі, рызыкуючы сваім жыццём, забягаюць у ахутаны пажарам дом, вызваляюць з палаючага горла агню людзей і жывёлу, выратоўваюць маёмасць, дастаюць з-пад завалаў пацярпелых і, бывае так, што самі гінуць...

Для сябе Сяргей даўно вырашыў, што стане пажарным, і два гады таму запісаўся ў гурток пажарных-выратавальнікаў.

— Заняткі ў гуртку пажарных-выратавальнікаў мяне цікавяць больш, чым школьныя, — шчыра прызнаўся Сярожа. — Таму стараюся іх не прапускаць. Разам са мной вучацца сябры. Мы любім экстрым. А на занятках яго ўдосталь: адно тое, што на шматпавярховік звонку будынка па спецыяльнай лесвіцы залазім... І робім гэта практыкаванне на хуткасць. Такіх прыкладаў хоць адбаўляй. Кіраўнік гуртка Эдуард Эдуардавіч Малышка вучыць нас многім прыёмам пажарнай справы. Таму я ведаю, што рабіць падчас пажару...

Словы хлопчыка пацвердзіліся сёлетняй восенню. Юнак прыйшоў дамоў са школы. Мама папрасіла схадзіць у магазін па хлеб. Калі выйшаў на лесвічную пляцоўку, «унюхаў» дым.

— Пахла паленай гумай і дрэвам. На пляцоўцы стаяў рэзкі пах, — успамінае хлопчык. — Мама таксама адчула, што пахне паленым. Мы падумалі, што ў кагосьці згарэла на пліце ежа...

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

Прыгожае жыццё

## КАСТЫНГІ НА «МІС БЕЛАРУСЬ-2008» ПАЧЫНАЮЦЦА

**Пачынаюцца рэгіянальныя адборачныя туры VI Нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь-2008». Першы кастынг адбудзецца ў Гродне 9 студзеня.**

Праглядваць беларускіх прыгажунь будуць у наступным парадку: Ліда (10 студзеня), Бабруйск (15 студзеня), Мазыр (16 студзеня), Гомель (17 студзеня), Брэст (23 студзеня), Пінск (24 студзеня), Баранавічы (25 студзеня), Орша (1 лютага), Віцебск (2 лютага), Наваполацк (3 лютага), Магілёў (4 лютага), Салігорск (8 лютага), Барысаў (9 лютага) і Мінск (10 лютага). Прэтэндэнткам на тытул «Міс Беларусь-2008» неабходна прыйсці на кастынг без макіяжу, з пашпартам, раздзельным купальнікам, туфлямі на высокіх абцасах, рызінкай для валасоў. Удзельніцамі конкурсу могуць стаць прывабныя дзяўчыны ва ўзросце ад 18 да 24 гадоў, якія маюць беларускае грамадзянства і пастаянна пражываюць на тэрыторыі нашай краіны, ніколі не бралі шлюб і не маюць дзяцей. Да ўдзелу дапускаюцца беларускі ростам не ніжэй за 175 сантыметраў, не могуць удзельнічаць пераможцы намінацый, у тым ліку «Міс Беларусь», мінулых нацыянальных конкурсаў, а таксама асобы, якія маюць дачыненне да фота і відэаматэрыялаў эратычнага і парнаграфічнага характару.

— Узяць удзел у «Міс Беларусь» мне прапанавала маці, — узгадвае «Міс Беларусь-2006» Кацярына Літвінава. — Раней я спрабавала сябе ў конкурсе «Міс магіляўчанка». Усім дзяўчатам, якія прыйдуць сёлета на адборачныя туры, я раю быць упэўненымі ў сабе, верыць у свае сілы, — дае параду дзеючая пераможца.

Фінал «Міс Беларусь-2008» пройдзе вясной у Палацы Рэспублікі. Журы вызначыць не толькі самую прывабную беларуску ў гэтым годзе, але і назаве «І Віцэ-Міс», «ІІ Віцэ-Міс», «Міс зачараванне» і «Міс фота». Прадстаўнікі СМІ выберуць «Міс прэса», гледачы — «Міс глядацкіх сімпатый», а самі канкурсанткі назавуць «Міс сяброўства». Нагадаю, што Нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь» праводзіцца міністэрствамі культуры, адукацыі, а таксама Мінгарвыканкамам, Нацыянальнай школай прыгажосці, БРСМ пры садзейнічанні фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі.

**Ірына ПРЫМАК.**

Выпрабавана на сабе

# САМЫ ПРЫБЫТКОВЫ БІЗНЭС У ІНТЭРНЭЦЕ?

**Мы жывём у інфармацыйным веку. Сёння інфармацыя выходзіць на першае месца, і часам вельмі складана з усяго патоку вылучыць менавіта тое, што трэба. Нам пастаянна нешта паведамляюць, штосьці раяць... У падземных пераходах раздаюць паперкі, на слупах вешаюць аб'явы, рэклама — усюды... А ўзяць той жа Інтэрнэт. Чаго толькі там не знойдзеш?! Пачынаючы ад кніжных навінак і заканчваючы тым, як зрабіць ядзерную бомбу.**

**У апошні час усё часцей мне на вочы трапляецца інфармацыя аб спосабах заробку ў Інтэрнэце. Прапаноўваюць паўдзельнічаць у розных праектах. Самым галоўным для «прадаўцоў» падобнай інфармацыі з'яўляецца тое, каб вы заплацілі грошы за прапанаваную інфармацыю. А далей ужо вашы праблемы: вернеце вы свае грошы, або не.**

### Цікавая прапанова

Нядаўна, напрыклад, на вочы трапілася вельмі цікавая інфармацыя. Пагадзіцеся, прывабна гучыць: «Самы прыбытковы бізнэс у Інтэрнэце».

*«Праграма заробку «N.A.T.L.A». Гэты сайт з'яўляецца адным з новых кірункаў сучаснага бізнэсу. Ён нічога агульнага не мае з «укладаннямі», або «працэнтамі». Гэта класічны бізнэс, які прапануе людзям больш магчымасці разбагацець, чым любы іншы від бізнэсу, за кошт сучаснай маркетынгавай канцэпцыі».*

Далей «працадаўцы» распавядалі аб усіх плюсах удзелу ў гэтым праекце. Яны абяцалі вялізныя грошы. І самае галоўнае, што для ўсяго гэтага не патрэбна спецыяльная адукацыя і ніякія навыкі.

*«Гаворка ідзе аб прынцыпова новым бізнэсе, лагічным і простым настолькі, што незалежна ад вашых ведаў, або вопыту, першы істотны прыбытак вы зможаце пачаць атрымліваць ужо заўтра раніцай. Перспектыва: дзесяць тысяч долараў — гэта сума, якую з часам вы будзеце зарабляць кожны месяц.*

*Сістэма ўсё робіць сама, персанальныя старонкі ўдзельнікаў прадстаўлены на пяці мовах. Уся праца ўдзельніка зводзіцца толькі да рэалізацыі сярод пакупнікоў лічбавага архіва, а дакладней трох яго частак. Дзякуючы ўніверсальнай паслядоўнасці дзеянняў, веданне моў не патрабуецца».*

Атрымліваецца, што праца не патрабуе вялікай колькасці часу, не складаная. Да таго ж заробак у дзесяць тысяч долараў многіх цалкам задавальняе. Выходзіць, што грошы ўдзельнікі праекта атрымліваюць за продаж інфармацыі.

*«Удзельнікам праекта неабходна высылаць пакупніку па электроннай пошце запытаную частку архіва, пасля таго як той зробіць аплату. Аб запыце, які паступіў, можаце быць аўтаматычна апавешчаныя па E-MAIL, SMS, WAP, або ICQ паведамленнем. Выканалі запыт — атрымалі грошы. Ніякага масавага рассылання лістоў і агітацыі, толькі бізнэс. Прынцып дзеяння праекта празрысты, лагічны і просты. Стаўшы ўдзельнікам праекта, вам на e-mail высылаецца афіцыйная спасылка на першую частку і адкрываецца персанальная старонка. Вашы рэквізіты будуць займаць першы радок прадаўца першай часткі. Вам аўтаматычна пачнуць паступаць запыты, бо менавіта гэтую старонку праект пачынае рэкламаваць на галоўнай сваёй старонцы. І гэта будзе доўжыцца датуль, пакуль не прыцягне для вас траіх пакупнікоў на першую частку».*

Я чытаў і не мог зразумець, што ў гэтым праекце мяне насцярожвае. Падаецца, усё правільна, няма ніякіх падводных камянёў. Але ўсё роўна, нешта насцярожвала. Далей паведамлялася, што ў гэтым бізнэсе ніколі не будзе «крайніх», бо ў праекце цвёрдыя правілы. *«Сфарміраваўшы сваю сетку аднойчы, вы будзеце атрымліваць з яе прыбытак зноў і зноў, з хуткасцю, якая паказвае ўсю моц імгненнай глабальнай сувязі сеткі Інтэрнэт».*

Далей гаворка ішла аб тым, што трэба рабіць пачаткоўцам гэтага прыбытковага праекта. Пагадзіцеся, адразу цяжка зразумець, у чым складаецца сэнс працы. І што трэба рабіць? Спачатку неабходна стварыць электронны кашалёк, на які трэба пакласці два долары. Далей ідзе рэгістрацыя ў якасці агента па продажах.

Пасля ўдалай рэгістрацыі вам будзе паведамлены адрас персанальнай старонкі і дадзена інструкцыя па апрацоўцы запытаў. Сама ж праца заключалася ў тым, каб рэкламаваць гэты праект, знаходзіць людзей, якія хочуць зарабіць дзесяць тысяч долараў у месяц, але перад гэтым укласці невялікую суму грошай у бізнэс. Уся праца зводзілася да таго, каб атрымліваць пераводы ад пакупнікоў і заяўкі ад ахвотнікаў зарабіць. Ваша ж задача заключалася б у тым, каб кожны дзень правяраць пошту і глядзець, ці не прыйшоў пераводаў ад пакупніка. Пасля атрымання перакладу трэба было паведаміць пакупніку «сакрэтную» спасылку (з якой ён можа запампаваць прадукт).

Але самае цікавае наперадзе. Справа ў тым, што атрыманымі грашыма трэба было дзяліцца з арганізатарамі праекта. І так атрымлівалася, што на першым этапе прыбытак складаў тры долары. Ад гэтай сумы трэба адняць выдаткаваныя два. Так што прыбытак складаў долар.

*«Пасля трох запытаў, на працягу тыдня вы павінны прыняць рашэнне: альбо купляеце спасылку на другую частку за $2,95, або забіраеце заробленыя $3 сабе і кідаеце бізнэс. Чаму? Ды таму, што пакупнікі абавязкова будуць запытваць другую і наступныя часткі, якія трэба прадаць ім. Калі гэтага не зрабіць, то пакупнікі могуць паскардзіцца ў N.A.T.L.A. У такім выпадку іх перададуць да іншага агента, а вас «звольняць».*

Як аказалася, за другую частку вы атрымліваеце ад кожнага пакупніка $2,95, але ўсё пакідаеце сабе. У N.A.T.L.A. ужо нічога адсылаць не трэба. Пасля атрымання дзевяці запытаў на другую частку вы заробіце $26,55. І на працягу тыдня павінны зноў прыняць рашэнне: або купляеце спасылку на трэцюю частку за $26,55, або забіраеце сабе гэтыя грошы і пакідаеце бізнэс.

Трэцюю частку вы можаце прадаваць за $26,55 і ўвесь прыбытак пакінуць сабе.

Зразумела, што на любым этапе, можна працягваць прадаваць і першую, і другую, і трэцюю часткі, атрымліваючы дадатковы прыбытак і пашыраючы сваю сетку пакупнікоў.

*«Для тых, хто рэалізаваў першы пакет, ёсць магчымасці і для далейшага «росту». Маюцца яшчэ архівы, таксама з трыма часткамі, і там заробак яшчэ больш сур'ёзны, а сетка пакупнікоў будзе ўжо гатовая».*

### Як вам праект?

*«Вам спадабаўся праект? Гэта і ёсць сапраўдная MLM, а не піраміда, не гандаль «паветрам».*

*У гэтым бізнэсе ніколі не будзе «крайніх». У праекце ёсць кантроль за прытрымліваннем правілаў. Сфарміраваўшы сваю сетку аднойчы, вы будзеце атрымліваць з яе прыбытак зноў і зноў.*

*Над усёй працай сістэмы здзяйсняецца агульны кантроль людзьмі, якім забаронена ўдзельнічаць у гэтым бізнэсе. Гэты праект для актыўных людзей. Кожны новы дзень арганізатарамі робіцца ўсё, каб апраўдаць аказаны давер. Стаўшы ўдзельнікам праекта, вы зможаце ўпэўніцца ў гэтым асабіста».*

### Высновы

На першы погляд усё можа здацца вельмі перспектыўным. Але падумайце самі. Што гэта за праца, калі спачатку трэба заплаціць грошы, каб прыступіць да яе выканання. А ў чым складаецца праца? Рассыланне нейкага архіва.

Заўважце, працадаўцы нам не паведамляюць аб гэтым архіве нічога падрабязнага. Застаецца толькі меркаваць, што гэта такое. Праца складаецца з трох частак. Прайшоўшы першую частку, можна зарабіць тры долары. Пры гэтым выдаткаваць трэба два. Атрымоўваецца, што праца сабе ў страту. Вельмі цікава. Паведамляецца, што сапраўдны заробак пачынаецца з другога этапа. Але і каштуе гэтая частка ўжо не два долары, а больш. А ў чым заключаецца сутнасць гэтага «самога прыбытковага бізнэсу ў свеце»? Правільна, трэба пералічыць на электронны кашалёк два долары, а потым рабіць тое, што душа пажадае. Можна шукаць такіх жа самых, як ты, якія паверацъ табе. А можна забыць аб гэтым.

Адразу відаць, што праект — чарговая піраміда, падман. Але пры гэтым чамусьці папулярнасць такіх прапаноў увесь час расце. Справа ў тым, што многія людзі хочуць быць паспяховымі і шчаслівымі. І тут ім прадстаўляецца такая магчымасць. Прычым усяго за два долары.

Многія на гэта і паддаюцца, а потым шкадуюць аб страчаных грашах. Праўда, ёсць і такія людзі, якія не губляюць надзеі, спрабуюць свае сілы ва ўсё новых і новых праектах. Хто ведае, можа, калі-небудзь ім пашанцуе...

**Сяргей ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

# Вольга БАРАБАНШЧЫКАВА: «ШОЎ-БІЗНЭС — ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ВІД СПОРТУ»

***З Вольгай Барабаншчыкавай заўсёды можна чакаць сюрпрызаў. Размаўлялі мы з ёй у рэстаране неяк раніцай, а калі сабраліся разлічыцца, высветлілася, што за нас заплацілі маладыя людзі, што сядзелі за суседнім столікам. Заплацілі і зніклі — мы і «дзякуй» не паспелі сказаць. Дробязь, безумоўна, але нам было прыемна.***

**— Вольга, ты тэлевядучая, трэнер жаночай каманды па тэнісе, спявачка, здымаешся ў тэлепраектах. Адкажы, калі ўсё паспяваеш?**

— Маючы жаданне, можна паспець усё. Такі ў мяне рытм жыцця. На тэлебачанні я вяду перадачу толькі адзін раз на тыдзень. Але здымкі, інтэрв'ю, запіс праграмы — гэта ўжо неад'емная частка майго жыцця. А што датычыцца трэнерства, я — не той трэнер, які кожны дзень павінен быць на корце. Я вырашаю арганізацыйныя пытанні, напрыклад, сабраць каманду перад спаборніцтвамі, правесці збор, ушанаваць нашых спартсменаў — самае цікавае, я сказала б.

**— Якое месца ў жыцці зараз займае тэніс?**

— Да нядаўняга часу я гуляла даволі многа — некалькі разоў на тыдзень. Але потым у мяне з'явіліся праблемы з шыяй — гэта наступствы траўмы яшчэ з часоў маіх выступленняў. Ужо больш за два месяцы я не гуляю ў тэніс увогуле. Сумую, вядома ж. Калі ўрач дазволіць, я з задавальненнем вярнуся на корт. Але я ўжо не прафесійная тэнісістка. Мне больш патрэбна крыху іншая фізічная нагрузка — з задавальненнем я пазаймалася б аэробікай, танцамі, але і гэтага нельга. Адзіная фізічная нагрузка, якая дазволена, — гэта хада. Але ж яна надта нудная для мяне.

**— Ты рэгулярна з'яўляешся ў рэкламе аднаго салона прыгажосці. Можаш сабе дазволіць правесці там дзень?**

— Такое здараецца, але вельмі-вельмі рэдка. Мне складана запланаваць такі дзень, бо, напрыклад, увечары могуць патэлефанаваць і сказаць, што заўтра здымкі для праграмы ці яшчэ штосьці. Ды і ўвогуле мне сумна сядзець дзень у салоне прыгажосці — у гэты час можна так шмат зрабіць. SPA-працэдуры я звычайна дазваляю сабе, калі я дзесьці на адпачынку, дзе адпачываю і фізічна, і эмацыянальна.

**— Нядаўна ўсе напісалі аб тым, як Вольга Барабаншчыкава адзначала свой дзень нараджэння — у рэстаране яна сустракала гасцей у хатнім халаце і тапачках. Святы заўсёды ў цябе праходзяць так крэатыўна?**

— Такога раней яшчэ ніколі не было. За тыдзень да дня нараджэння ў мяне быў дрэнны настрой, звязаны з некалькімі не вельмі прыемнымі падзеямі яшчэ з мінулага лета. І ў адзін момант я зразумела, што я хачу свята, вырашыла адсвяткаваць не дома, як звычайна, а ў рэстаране, з вялікай колькасцю гасцей. Спачатку планавала запрасіць чалавек 15, а ў выніку атрымалася чалавек 45. Я патэлефанавала сяброўцы, у якой ёсць святочнае агенцтва, яна адразу дала мне некалькі ідэй. Магчыма, мы б прыдумалі і яшчэ штосьці больш незвычайнае, аднак тэрміны ў нас былі абмежаваныя. Калі на мяне спачатку апранулі халат і хустку, мне захацелася адтуль збегчы. Давялося крыху выпіць віна, каб увайсці ў ролю. Госці былі ў шоку. Іх запрасілі на гламурную вечарынку з дрэс-кодам, усе прыйшлі ў касцюмах і вячэрніх сукенках. І не чакалі ўбачыць мяне з каструляй за прыгатаваннем супу, з прасам, з дзіцем — дыджэй уключаў гукі яго плачу, і я бегла яго ўкачваць. Я ўвайшла ў ролю, што ў мяне нават гаворка адпаведная з'явілася. Было вельмі весела.

**— Што запомнілася з падарункаў?**

— Усе падарункі для мяне каштоўныя, але ёсць найбольш каштоўныя — вось, напрыклад (Вольга дэманструе на пальцы брыльянтавы пярсцёнак. — **Аўт.**). Гэта падарунак аднаго маладога чалавека. З сябрамі і знаёмымі мы на тым узроўні, што можна сказаць, што табе патрэбна ў якасці падарунка на дзень нараджэння. Было шмат кветак, калі на наступны дзень прыехала ў рэстаран іх забіраць, была шакіравана колькасцю букетаў, мая кватэра пасля некаторы час нагадвала аранжарэю. Некаторыя проста падарылі грошы. У асноўным падарункі былі для кватэры. Я вельмі люблю там перастаўляць мэблю, ствараць утульнасць. У мяне мама — мастак-архітэктар, яна мне вельмі дапамагала абсталяваць маю кватэру. Нягледзячы на тое, што ў нас новы дом, пад'езд жудасны. Спадзяюся, што калі-небудзь мы прывядзём яго ў парадак. Да нядаўняга часу там жылі бамжы. Кожную ноч, у дзве гадзіны, у тры, у пяць мне па дамафоне тэлефанаваў нехта Мальцаў, казаў, што ён з дваццаць восьмай, і я яму заўсёды адчыняла пад'езд. Пасля высветлілася, што ў дваццаць восьмай кватэры ніхто тады яшчэ не жыў, а гэта быў бомж, які мяне так «разводзіў». Цяпер ва ўсіх маіх знаёмых, якія да мяне ў госці прыязджаюць, пароль «Мальцаў з дваццаць восьмай».

**— Калі праводзіць аналогіі, па ступені прыязнасці да свецкага жыцця цябе можна параўнаць з Ксеніяй Сабчак. Яшчэ ўзнікаюць асацыяцыі з таксама спяваючай спартсменкай Ганнай Семяновіч. Апошнім часам, дарэчы, у асноўным абмяркоўваюць яе выдатныя формы, якімі яна моцна вылучаецца. Як ставішся да такіх дасягненняў сучаснай пластычнай хірургіі?**

— Я лічу, што ўсяму павінна быць пэўная мяжа... Хоць калі гэта камусьці падабаецца, яно мае права на існаванне. Мне асабіста гэта не падабаецца, я прыхільніца натуральнай прыгажосці. А што датычыцца пластычнай хірургіі ўвогуле, я не маю нічога супраць, асабліва калі гэта дапамагае чалавеку адчуць сябе больш камфортна. Дапусцім, мне таксама не надта падабаецца мой нос, магчыма, калі-небудзь я і падумаю над тым, каб яго крыху выправіць. Але ўсё ў межах разумнага, вядома ж.

**— PLAYBOY здымацца больш не запрашае?**

— Не запрашае, упусціла я свой шанц...(*Смяецца.* — **Аўт.**) Пра PLAYBOY на самай справе я ўспамінаю толькі на інтэрв'ю, калі мне задаюць гэта пытанне. Але калі б і запрасілі, умовы ў мяне былі б ранейшыя: распрануцца я магу топлес — гэта максімум, і чорна-белы фатаздымак. Мне вельмі падабаюцца чорна-белыя здымкі. Я яшчэ шмат чаго хачу паспець у гэтым жыцці, і адно з маіх жаданняў — заняцца фатаграфаваннем. Акрамя таго, вывучыць некалькі замежных моў, навучыцца іграць на фано, на гітары...

**— Адну са сваіх мараў — стаць спявачкай — ты ўжо ажыццявіла. Шоу-бізнэс паказаў табе свой аскал ці ў нас у гэтым плане — ціхае балота?**

— Хутчэй, другое, калі параўноўваць з расійскім шоў-бізнэсам. Але гадасці таксама хапае. Хоць я прызвычаілася, у мяне ёсць сваё кола знаёмых. Мне падабаецца Карына — і яе творчасць, і як чалавек яна мне сімпатычная, Улялюм таксама. У мяне добрыя адносіны з Da Vinci, з хлопчыкамі з «Тяни-Толкай», з Лёшам Хлястовым...

**— Штосьці ў спісе пераважна хлопчыкі...**

— З дзяўчынкамі ў мяне заўсёды былі пытанні, пачынаючы з самага дзяцінства. Я стаўлюся роўна да ўсіх. Амаль да ўсіх. А тое, як ставяцца да мяне, мяне не вельмі турбуе. Для мяне важнае толькі стаўленне да мяне маіх блізкіх людзей. У шоў-бізнэсе хапае зайздрасці, гэта ўсё-такі індывідуальны «від спорту».

**— Нядаўна ты асвоіла яшчэ адзін від спорту — водныя лыжы. І нават выйграла адпаведны этап у тэлепраекце «Выдатная сямёрка»...**

— Адкуль ты ведаеш, што выйграла? Фінал яшчэ ж не паказвалі... Так, сапраўды, я выйграла гэты этап. І шкада, што мы не сустрэліся з табой падчас здымак — мае рукі ўяўлялі суцэльны крывавы мазоль. Мышачны боль быў такі, што я не магла падняць рукі, каб зачыніць багажнік у машыне — гэта без перабольшвання. Тым не менш я засынала і прачыналася з думкамі аб водных лыжах. Да гэтага я адзін раз спрабавала праехацца на адпачынку ў Тайландзе гадоў сем таму — і ўсё. Так што ў праекце гэта было як упершыню. Я думаю, што мне дапамагла мая фізічная падрыхтоўка. Здымкі праходзілі на Пцічы, у нас выдатная каманда, адна з наймацнейшых у Еўропе, там сімпатычныя хлопчыкі працавалі, інструктары ў нас выдатныя былі.

**— З кімсьці з удзельнікаў праекта пасябравала?**

— Мы кантактуем з Вовам Ухцінскім. Нядаўна нават ездзілі разам на канцэрт у папраўчую ўстанову. Такія канцэрты арганізуе шведская арганізацыя «Крыс», якая дапамагае адаптавацца людзям, якія пакідаюць месцы пазбаўлення волі. Пад'язджаем і я адчуваю, што пачынаю хвалявацца: як мяне прымуць? Калі выйшла на сцэну, раптам усё прайшло. Калі раней адной з самых удзячных аўдыторый я лічыла спецназ, то зараз і зняволеных магу сюды дадаць. Нам паказалі іх царкву, зняволеныя самі выразаюць абразкі, нам нават падарункі падрыхтавалі, прымалі душэўна, адным словам. Спадзяюся, што наш прыезд не пройдзе бясследна, хтосьці з іх перастане рабіць глупствы і зразумее, што жыць трэба на волі.

**— Якія, акрамя водных лыжаў, экстрэмальныя віды адпачынку асвоіла?**

— Напэўна, магу сказаць, што асвоіла з мінулай зімы горныя лыжы. Я была ў «Чырвонай Паляне» разам з нашай дэлегацыяй на адкрыцці санаторыя, дык у апошні дзень каталася з горкі апошняга самага высокага ўзроўню, праўда, часткова на попе. Яшчэ ў Аўстрыю ездзіла на гарналыжны курорт. Пару разоў у Лагойску з'язджала, хоць цяпер там для мяне ўжо дзіцячая горачка. Яшчэ вельмі хачу асвоіць сноўборд, хоць калі я ўпершыню паспрабавала, праверыла ўсе агароджы, дзіўна, што засталася без пераломаў.

**— Якія краіны падабаюцца?**

— Дзе б я ні была, ужо праз тыдзень мне так хочацца дадому, асабліва летам. Хоць вельмі падабаецца Аўстралія. Іх лад жыцця — крыху расслаблены. Там вельмі многа прыгожых месцаў. І яда якая хочаш — шмат морапрадуктаў, якія я вельмі люблю, ёсць і рускія рэстараны, увогуле любая кухня. Яшчэ люблю Італію, мне здаецца, нашы менталітэты найбольш падобныя, калі параўноўваць з астатнімі еўрапейцамі. Мне падабаецца Кіеў, там, мне здаецца, я змагла б жыць, у Маскве — не. Летам я ездзіла на Крыт, на Сардынію, там я пабывала ўпершыню. Адпачынак там лічыцца дарагім, няпростая тусоўка збіраецца, усе з'язджаюцца на яхтах... Я была там усяго чатыры дні, але ўражанняў засталося шмат.



**— А ў Куршавелі, модным у расійскіх алігархаў,ты яшчэ не пабывала?**

— Яшчэ пакуль не. Увогуле мяне не вельмі цягне ў тыя месцы, дзе шмат рускіх. Яны вельмі гучна сябе паводзяць... Я люблю больш спакойны адпачынак.

**— Як рэагуюць на дарозе на эфектную бландзінку на чырвоным джыпе?**

— Ой, у нас вельмі многа эфектных бландзінак, магчыма, не на чырвоных джыпах, а на іншых добрых машынах... Я мала на дарозе надаю ўвагі флірту. Я звычайна занята музыкай — падпяваю, падтанцоўваю, развучваю новую песню. Часам лаўлю на сабе вясёлыя погляды ці наадварот неўразумелыя.

**— У Руслана Салея таксама Nissan-Infiniti, толькі чорны. Выбіралі, выпадкова, не разам?**

— Не, у Руслана ў першага з'явілася. І тады яна мне вельмі спадабалася. У яго яшчэ з камерай задняга бачання. У мяне, на жаль, няма такой опцыі. І так складана было знайсці, нават у Амерыцы. Мне адразу прапанавалі чырвоную, хоць я спачатку падумала, што гэта будзе занадта задзірліва. Але калі мне паказалі яе на здымку, я адразу сказала «так». І кожны раз, калі я выходжу з дома нават у дрэнным настроі, у дрэннае надвор'е і гляджу на гэты ярка-чырвоны колер, разумею, што жыццё ж наладжваецца!

**— Куды ты апранаеш сваю самую дарагую сукенку ад Раберта Кавалі?**

— У мяне ўсе сукенкі пераважна ад Раберта Кавалі, а гэту я апранула на юбілейны канцэрт Аляксандра Мядзведзя, дзе была вядучай, і ў Вільнюсе на адкрыцці клуба «Паша» і «Вільнюскіх варотаў». Дарэчы, дзякуючы гэтай сукенцы, я трапіла там ва ўсе глянцавыя часопісы. Яна вельмі шыкоўная, там такі выраз...

**— Звычайна дзяўчаты «западаюць» на туфлі, сумачкі...**

— Я не з'яўляюся выключэннем. У мяне, магчыма, 50, а тое 60 пар абутку. Боцікаў не вельмі многа, у асноўным гэта туфлі, басаножкі. Трэба неяк сабе настрой узнімаць. У дрэннае надвор'е, калі хтосьці пакрыўдзіў, шопінгавая тэрапія — вельмі дзейсны для мяне метад, як і для ўсякай дзяўчыны. Гэта раней я амаль заўсёды хадзіла ў спартыўных касцюмах і кепачцы або ў джынсах. Цяпер па рабоце я павінна быць амаль заўсёды на абцасах. Не ведаю, як гэты стыль назваць, ну нейкі больш нафуфыраны, чым раней. Хацела вось сёння спаднічку апрануць, але надвор'е нейкае незразумелае. Але праз тыдзень я буду насіць спаднічкі — я еду на тыдзень адпачыць на Мальдывы. Я даўно марыла туды трапіць, разглядала малюнкі — бірузовая вадзічка, домікі на вадзе, пальмы, як у рэкламе «Баўнці». І зараз супала магчамасць з жаданнем. Мары збываюцца — я заўсёды так кажу.

**Гутарыла Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Спрэчнае пытанне

# «НЕ ЎТРЫМЛІВАЕ ГМА!» —

## Ці патрэбна нам такая маркіроўка?

**Сёння доля генетычна мадыфікаванай кукурузы ў агульным сусветным аб'ёме пасадак гэтай расліны складае 40 працэнтаў. Доля ГМ-бавоўны яшчэ большая — 60 працэнтаў, ГМ-соі — 80 працэнтаў. На пачатак 2007 года плошча, на якой вырошчваліся ГМ-культуры — 102 млн га (гэта прыкладна 20 тэрыторый нашай краіны). Апошнім часам кожны год азначаная лічба павялічваецца прыкладна на 10 млн га.**

**Пытанне небяспечнасці для здароўя чалавека ГМ-прадуктаў сёння застаецца адкрытым. Сярод вучоных і медыкаў ёсць і прыхільнікі ГМА, і праціўнікі. Пакуль апаненты ламаюць коп'і ў навуковых баталіях, спажыўцы кожны дзень вымушаны рабіць для сябе выбар: ужываць прадукты з генетычна мадыфікаванымі кампанентамі ці не? Вось толькі ці заўсёды за намі пакідаюць гэтае права — выбіраць?**

### Нашы правы

У Законе «Аб абароне правоў спажыўцоў» (2002 год) замацаванае права спажыўца на інфармацыю аб тавары і на свабодны выбар тавараў. Законам прадугледжваецца, што інфармацыя аб таварах абавязкова павінна ўтрымліваць указанне на тое, што прадукт харчавання з'яўляецца генетычна мадыфікаваным, альбо ў ім выкарыстаны ГМ-складальнікі. Паводле артыкула 10 Закона «Аб якасці і бяспецы харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў для жыцця і здароўя чалавека» (2003 год), інфармацыя аб якасці і бяспецы харчовай сыравіны і прадуктаў харчавання павінна ўтрымлівацца ў суправаджальных дакументах, на ўпакоўцы, этыкетках, альбо даводзіцца да ведама насельніцтва іншым спосабам і мець указанне на тое, што харчовыя прадукты з'яўляюцца генетычна мадыфікаванымі, калі ў іх ёсць ГМ-кампаненты.

Асноўным пунктам пастановы Савета міністраў Беларусі «Аб некаторых пытаннях інфармавання спажыўцоў аб харчовай сыравіне і харчовых прадуктах» (№ 434 ад 28 красавіка 2005 года) з'яўляецца абавязковае ўказанне на кожнай адзінцы спажывецкай тары ці на іншым носьбіце інфармацыі аб тым, што сыравіна і самі прадукты з'яўляюцца генетычна мадыфікаванымі. Вытворчасць і гандаль дзіцячым харчаваннем, якое вырабляецца з выкарыстаннем ГМ-складальнікаў, забаронены. Тое ж датычыцца і гандлю прадуктаў, атрыманых з ГМ-кампанентаў, пры адсутнасці на іх адпаведных дакументаў.

Беларускім заканадаўствам прадугледжваецца абавязковая маркіроўка ўсёй прадукцыі з утрыманнем ГМА. А ці выконваецца гэта на практыцы?

### «Мёртвы» закон?

— Закон «Аб якасці і бяспецы харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў для жыцця і здароўя чалавека» быў прыняты ў 2003 годзе (я прадстаўляў яго тады ў парламенце), — расказвае **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ЛЕКТАРАЎ**, — аднак праведзеныя праверкі паказалі, што ў гандлі пра яго да гэтай пары не ведаюць. Восенню 2006 года разам з прадстаўнікамі Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі мы прайшлі па сталічных магазінах. Адабралі на выбар каля 5 тысяч найменняў харчовых прадуктаў без маркіроўкі «Утрымлівае ГМА». Аказалася, што каля 10 працэнтаў з выбранай групы мелі ў сваім складзе ГМ-кампаненты. Як бачым, закон не выконваецца, і пры гэтым яшчэ ні адзін вінаваты (ні прадавец, ні вытворца) не быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.

У Беларусі забаронена выраб ляць дзіцячае харчаванне з выкарыстаннем ГМ-кампанентаў, аднак адно з айчынных прадпрыемстваў выпусціла такую прадукцыю з ГМА. На завод у Пскове паступіла партыя беларускага сухога малака, у якім аказалася 5 працэнтаў ГМА. Натуральна, нідзе ў суправаджальных дакументах наяўнасць ГМ-кампанентаў не была ўказана.

***Немагчыма прааналізаваць на ГМА ўсе прадукты харчавання. Толькі з бульбы вырабляецца каля 15 тысяч найменняў харчовых прадуктаў.***

На тэрыторыі Расіі зарэгістравана некалькі ліній ГМ-культур, якія адобраны для выкарыстання ў ежу чалавекам (соя, кукуруза, бульба, рыс, буракі). У нашай краіне не зарэгістравана ні адна. Валерый Мікалаевіч падкрэсліў, што недасканаласць беларускіх метадаў аналізу па выяўленні ГМА, а таксама абмежаванасць спіса прадуктаў, абавязковых для праходжання тэстаў на ГМ-кампаненты (пакуль гэта толькі соя, кукуруза і вырабы з іх), не могуць цалкам абараніць спажыўцоў ад падману з боку вытворцаў і прадаўцоў.

— Возьмем для прыкладу расійскія варэнікі «Любимые», — працягвае дэпутат. — У графе «склад» чытаем: клубніцы, цукар, крухмал, мука, яйка. Ні соі, ні кукурузы тут няма, значыць, паводле існуючых у нас нормаў, правяраць варэнікі на ГМА не трэба. А што, клубніцы ці крухмал не могуць быць генетычна мадыфікаванымі? Спажывец мае права ведаць, што ён ужывае! Той жа рыс. Самі мы яго ў Беларусі не вырошчваем. Набываем замежны. А на ГМА не правяраем!

Для таго, каб змяніць сітуацыю ў лепшы бок і забяспечыць выкананне на практыцы нацыянальнага заканадаўства па біябяспецы, Валерый Лектараў прапанаваў, папершае, распрацаваць дакумент, у якім была б дакладна прапісана схема рэгістрацыі ГМ-ліній і вызначана, хто гэтым павінен займацца. Па-другое, пашырыць пералік харчовых прадуктаў, якія падлягаюць абавязковаму аналізу на ГМА. Патрэцяе, прадугледзець адказнасць усіх зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў, праз якія «праходзяць» харчовыя прадукты і харчовая сыравіна.

У Маскве, аб'яўленай мэрам Лужкоў зонай, свабоднай ад ГМА, практыкуецца добраахвотная маркіроўка прадуктаў «Не ўтрымлівае ГМА!». Што датычыцца беларускіх вытворцаў, пакуль толькі «Камунарка» пазначае эксперытныя партыі сваіх цукерак такім значком. «Я лічу, што гэта не пашкодзіць зрабіць і астатнім прадпрыемствам, — адзначыў дэпутат Лектараў. — Той, хто выкарыстоўвае маркіроўку «Не ўтрымлівае ГМА!», павышае свой рэйтынг, рэкламуе сваю прадукцыю, заваёўвае давер спажыўцоў».

### Нестыкоўка нормаў

— Сусветная арганізацыя аховы здароўя і Сусветная харчовая арганізацыя паводле задання ААН праводзяць пастаянны маніторынг генна-інжынерных арганізмаў, штогод друкуюць справаздачы па гэтай тэме, — расказаў **вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага каардынацыйнага цэнтра біябяспекі Барыс АНОШАНКА**. — Да гэтага часу ў свеце не ўстаноўлена ні аднаго адмоўнага эфекту генна-інжынерных арганізмаў ні на здароўе чалавека, ні на навакольнае асяроддзе.

Аналіз на наяўнасць ГМ-кампанентаў праводзяць у Беларусі 7 сталічных і абласныя лабараторыі. Вызначаецца пачатак і канец «устаўкі». Гэта стандартная працэдура. Любы прадукт з соі ці кукурузы не атрымае сертыфікат адпаведнасці без заключэння лабараторыі на адсутнасць ГМА. Такім чынам, усе прадукты харчавання з соя і кукурузай на паліцах нашых магазінаў без маркіроўкі «Утрымлівае ГМА» на 100 працэнтаў не з'яўляюцца генетычна мадыфікаванымі.

Чаму мы правяраем толькі сою і кукурузу? Папярэдне было вызначана, якія ГМА ўвогуле ёсць у свеце, а потым — якія з іх могуць трапіць на Беларусь. Генетычна мадыфікаваныя памідоры, напрыклад, вырошчваюцца толькі ў ЗША. А мы набываем таматы ў Расіі, Малдове, на Украіне. Там трансгенных памідораў няма. Як няма іх ні ў Польшчы, ні ў Іспаніі, ні ў Турцыі. Аналіз сітуацыі паказаў, што на беларускі рынак могуць трапіць толькі трансгенныя соя і кукуруза.

Сапраўды, да нас часам прыносяць на аналіз прадукты без адпаведнай маркіроўкі, у якіх мы выяўляем наяўнасць ГМ-кампанентаў. Як правіла, гэта расійская прадукцыя. Справа ў тым, што ў РФ лічыцца, што тавар не ўтрымлівае ГМА, калі ГМ-кампаненты складаюць у ім 0,9 працэнта і меней. Такі ж стандарт і ў Еўропе. А ў нас ён больш жорсткі — нуль працэнтаў. Адбываецца нестыкоўка: паводле расійскіх і еўрапейскіх нормаў прадукт не маркіруецца на ГМА, а для яго рэалізацыі на тэрыторыі Беларусі патрэбна маркіроўка. Увогуле ж, наша заканадаўства і сістэма дэтэкцыі генна-інжынерных арганізмаў дастаткова добрая.

Паводле слоў Барыса Юр'евіча, немагчыма прааналізаваць на ГМА ўсе прадукты харчавання. Толькі з бульбы вырабляецца каля 15 тысяч найменняў харчовых прадуктаў. Улічваючы гэта, калі стваралася агульная сусветная сістэма біябяспекі, за аснову былі ўзяты наступныя прынцыпы: бяспечныя харчовыя прадукты можна атрымаць толькі з бяспечных арганізмаў. Менавіта на гэта і быў зроблены акцэнт.

— У нас ёсць абавязковая маркіроўка «Утрымлівае ГМА», — працягвае Барыс Аношанка. — Зараз асобныя вытворцы выкарыстоўваюць добраахвотную маркіроўку «Не ўтрымлівае ГМА!». Ці абараняюць яны гэтым спажыўца? Возьмем для прыкладу расійскія чыпсы са значком «Не ўтрымлівае ГМА!» на ўпакоўцы. У іх складзе пазначаны соевы лецыцін, а ён можа быць атрыманы як са звычайнай соі, так і з трансгеннай. Вызначыць, з якой — немагчыма. Тое ж датычыцца і кукурузнага крухмалу. Насамрэч, маркіроўка «Не ўтрымлівае ГМА!» не абараняе спажыўца, а, хутчэй, уводзіць яго ў зман.

У чалавецтва няма іншага выйсця, як выкарыстоўваць ГМА. І Беларусь не будзе выключэннем.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

### Трансгенны ці звычайны?

***...Сёння шмат гаворкі вядзецца аб трансгенных прадуктах. Я набыў на рынку зерне ячменю з чатырохрадным коласам (звычайны двухрадны) для пасеву, але зараз падумаў: ці не трансгенны?***

**Пратасевіч С.,** *Уздзенскі раён.*

— На Беларусь трансгенныя гатункі зерня пакуль не паступаюць, — патлумачыў **вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага каардынацыйнага цэнтра біябяспекі Барыс АНОШАНКА**. — Калі гатунак трансгенны, ён меў бы абавязковую маркіроўку (краіны, якія падпісалі Картахенскі пратакол, абавязаны маркіраваць усё ГМ-насенне і генна-інжынерныя арганізмы). У любым падручніку па селекцыі можна знайсці і двухрадны і чатырохрадны ячмень. Ён вядомы людзям тысячу гадоў. Гэта розныя мадыфікацыі нармальнага ячменю, а не трансгенныя расліны.

### Якія прадукты могуць мець ў сваім складзе ГМА?

**Калі на маркіроўцы стаіць адзнака, што прадукт выраблены ў ЗША і ў яго складзе ёсць соя, кукуруза, рапс ці бульба, то верагоднасць таго, што ён утрымлівае ГМ-кампаненты, вельмі высокая.**

**Калі на этыкетцы стаіць надпіс «раслінны бялок», то гэта, хутчэй за ўсё, соя, верагодна — трансгенная.**

**Часта ГМА «хаваюцца» за індэксамі Е, аднак гэта не азначае, што ўсе дабаўкі Е ўтрымліваць ГМА ці з'яўляюцца трансгеннымі.**

ГМА можа знаходзіцца ў соевым лецыціне (лецыцін Е 322). Ён выкарыстоўваецца ў малочных сумесях, печыве, шакаладзе. Тое ж датычыцца рыбафлавіну (В2), вядомага яшчэ як Е101 і Е 101А, які можа быць выраблены з ГМ-мікраарганізмаў. Ён дадаецца ў кашы, безалкагольныя напоі, дзіцячае харчаванне і прадукты для пахудзення. Карамель (Е 150) і ксантан (Е 415) могуць быць выраблены з ГМ-зерня.

Іншыя дабаўкі, у якіх могуць утрымлівацца ГМ-кампаненты: Е 153, Е 160d, Е 161с, Е 308-9, Е 471, Е 472а, Е 473, Е 475, Е 476b, Е 477, Е 479а, Е 570, Е 572, Е 573, Е 620, Е 621, Е 622, Е 633, Е 624, Е 625, Е 951.

Часам на этыкетках назвы дабавак указваюцца толькі словамі.

**Соевы алей** — выкарыстоўваецца ў соўсах, пастах, піражных і добра прасмажаней ежы.

**Расліннага алей ці расліннага тлушч** — часцей сустракаецца ў печыве, чыпсах.

**Мальтадэкстрын** — від крухмалу, выкарыстоўваецца ў дзіцячым харчаванні, парашковых супах і парашковых дэсертах.

**Глюкоза ці глюкозны сіроп** — цукар, які можа быць выраблены з кукурузнага крухмалу, выкарыстоўваецца як падсалодвальнік. Утрымліваецца ў напоях, дэсертах і ежы хуткага прыгатавання.

**Дэкстроза** — як і глюкоза, можа быць выраблена з кукурузнага крухмалу. Прымяняецца пры прыгатаванні піражкоў, чыпсаў, печыве, выкарыстоўваецца як падсалодвальнік у высокаэнергетычных спартыўных напоях.

**Аспартам, аспасвіт, аспаміке** — падсалодвальнік, які можа быць выраблены пры дапамозе ГМ-бактэрый. Яго прымяненне абмежаванае ў шэрагу краін, дзе ён лічыцца небяспечным для здароўя. Утрымліваецца ў газаванай вадзе, дыетычных газаваных напоях, гумцы, кетчупах і г.д.

Многія лічаць, што надпіс на прадукце **«мадыфікаваны крухмал»** азначае, што там ёсць ГМА. Насамрэч мадыфікаваны крухмал атрымліваюць хімічным шляхам без прымянення геннай інжынерыі. Крухмал можа мець генна-інжынернае паходжанне, калі ён быў атрыманы з ГМ-кукурузы, ГМ-бульбы.

## «Баявое хрышчэнне»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

...Хлопчык кожны раз, калі выходзіць з пад'езда, паварочваецца да сваіх вокнаў і махае маме рукой. Так было і тады, калі ён пайшоў па хлеб. Калі павярнуўся, то ўбачыў, што з суседскага акна валіць чорны дым. Ні секунды не разважаючы, аўтаматам, як яго вучылі на занятках, пабег дамоў і набраў нумар пажарнай службы. Потым разам з мамай і суседам падышлі да дзвярэй кватэры, з якой «вылазілі» клубы чорнасіняга дыму і пачалі «трызвоніць» у званок, грукаць у дзверы. Рабілі гэта шмат разоў. Ніхто не адчыняў.

Яны не ведалі, ці ёсць людзі ў кватэры. Але вырашылі не ламаць дзверы. Сяржа патлумачыў, чаму рабіць гэтага нельга — трэба чакаць пажарных.

— Нам расказвалі, што калі падчас пажару адчыніш дзверы, агонь разгарыцца яшчэ больш, — дзеліцца ведамі дзевяцікласнік. — У гэтай кватэры раней жыў мой сябар, і я шмат разоў быў у яго ў гасцях. Таму ведаю, што там няма газавага балона, які мог бы ўзарвацца... Дакладна не скажу, што рабіў бы, каб у кватэры знаходзіліся гаспадары. Калі б дзверы былі адчынены, то зайшоў бы ўнутр, а калі так...

Праз некалькі хвілін прыехалі пажарныя і следам прыйшла гаспадыня, якая выйшла «на пяць хвілін» у магазін. Аказалася, што яна пакінула ўключаную пральную машыну-аўтамат...

...У кватэры гарэлі сцены ў ваннай і кухні. У пакоі ад дыму пачарнелі рэчы. Супрацоўнікі аддзела па надзвычайных сітуацыях эвакуіравалі з кватэр жыхароў дома і хутка патушылі пажар...

Жанчына тады не ведала, хто выратаваў яе кватэру і ўвесь трохпавярховы дом. А Сяржа — хлопец спакойны, сарамлівы, — сам не пахваліўся. Усё ж такі, хтосьці з суседзяў расказаў гаспадыні пра Сяржу і яна яго аддзячыла. А жыхары дома, дзе жыве хлопец, лічаць яго героем...

— Нічога гераічнага не бачу, — шчыра кажа юнак. — Нас вучылі, як паводзіць сябе ў такіх сітуацыях. Напэўна, кожны на маім месцы зрабіў бы гэтак жа. Тым больш пажар быў каля маёй кватэры. Як тут застацца абыякавым?..

Вось такі ён сціплы юны герой Сяргей, які марыць паступіць у вышэйшую ўстанову МНС, а скончыўшы яе, — стаць пажарным-выратавальнікам. Напэўна, гэта ў яго атрымаецца. Бо «баявое хрышчэнне» ён ужо прайшоў...

**Аляксандр СЯНЮЦЬ.**

## ПЕРАМОГІ ЮНЫХ ТАЛЕНТАЎ БЕЛАРУСІ

У пачатку снежня ў Маскве адбыўся Міжнародны дзіцячы конкурс творчасці, прыгажосці, таленту і нацыянальнага касцюма «Міні Міс і Міні Містар Хрустальная карона International 2007». Нашу краіну прадстаўляла выхаванка цэнтра творчасці, прыгажосці і таленту Імідж-дызайн студыі «Вадалея» Рэспубліканскага Палаца культуры ветэранаў **Марыя Сідарэнка** (10 гадоў, г. Магілёў) — менавіта яна і стала ўладальніцай Хрустальнай кароны і ўганаравана высокімі тытуламі «Міні Міс Хрустальная Карона» і «Лепшае партфоліо».

Міжнародны дзіцячы фестываль «Свет талентаў 2007» прайшоў у Кіеве. Сярод больш чым 300 удзельнікаў была і 9-гадовая мінчанка Анастасія Гуцікава. Менавіта беларусачка заняла другое месца ў акцёрскім майстэрстве і заваявала тытул «Міні Міс Фота Свету».

На мінулым тыдні ў Палтаве завяршыўся Міжнародны конкурс «Нараджэнскі анёл». Мінчанка **Настасся Гуцікава** заваявала першае месца за фотавобразы і атрымала званне «Залаты Анёл».

У папярэднія гады пераможцамі прэстыжных міжнародных дзіцячых форумаў былі Анастасія Нікіфарава, Кацярына Браневіч, Юлія Чарнашэй, Эка Джалагонія. Высока адзначаны фотадызайнерскія работы студэнтак Беларускай акадэміі мастацтваў Люсі Ралько і Ірыны Арцюшэнкі.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Падрастаюць і новыя таленты — Наста Гамолка, Аксана Пасініцкая, Таня Меднікава, Алена Паўлюкевіч, Анжэла Карпечанка, Андрэй Дзмітрук і многія іншыя.

Перамогі беларускіх дзяцей на прэстыжных творчых форумах — красамоўнае сведчанне таго, наколькі багатая наша краіна юнымі талентамі», — гаворыць кіраўнік Імідж-дызайн студыі «Вадалея» Кацярына Пашкевіч.

**Уладзя ТАЦЦЯНЧЫК.**

## СЯМЕЙНЫ СЕРЫЯЛ «ЖАНАЦІКІ»

**Да свайго мужчынскага сораму, усё ж такі прызнаюся... Я ўмею мыць посуд, ведаю, што такое венік і чым ён лепшы за пыласос, і мяне без усялякай боязі можна адправіць на кірмаш па прадукты. Калі яшчэ быў халасты (эх, залаты час!) ніколі б не раскрыў гэтую страшэнную ваенную тайну. Але ўсё роўна, калі зараз выбіраю мяса на Камароўцы, то абавязкова паплачуся гандляркам, што мяне жонка прыб'е, калі прынясу дадому непрыгожы кавалак, ці ён акажацца з косткай унутры. Праўда, Ганначка мая параіла, калі ў першы раз у статусе мужа, склаўшы ў кішэню доўгі спіс пакупак, накіраваўся я «здабываць маманта», каб казаў усім, быццам калі што не так, то прыб'е не жонка, а цешча. Тады спрытныя жанчынкі-прадаўцы будуць падсоўваць толькі лепшае, а то цешчы, мне ўжо паспелі патлумачыць, розныя бываюць.**

Размеркаванне абавязкаў ў сям'і, ужо на вопыце ведаем, справа адказная. Спрадвечныя «мужчынскія» і «жаночыя» справы мне не даюць спакою дагэтуль. Раней, калі быў герой ваш зусім маленькім, то ўпэўніваўся, што абавязак мужа — цягаць розныя хатнія грузы і рабіць рамонт, а жонкі — гатаваць ежу. Потым погляды мае сталі мяняцца. Зараз прыйшла перакананасць, што мужчыну да твару і выкідваць смецце, і нават (жах які) мыць ракавіну.

Але вось несправядлівасць. Ганначка, ну ні як не перавучыць яе, нізавошта не згаджаецца засвоіць такую цікавую, карысную, змястоўную навуку, як замена крана. Быццам бы яна дзяўчынка, і з нараджэння не здольная на такія подзвігі. І пры гэтым заяўляе, што ў сям'і ўсе павінны быць роўныя, і хто якую справу выконвае, не мае значэння. Не, я таксама ўпэўнены, што бытавыя і рамонтныя работы павінен выконваць муж, але дзе ж справядлівасць, паважаныя? Мне, значыць, трэба ўмець рабіць усё, а ёй — толькі частку. А калі я паеду кудысьці? Хто дапаможа перакрыць ваду ў трубе, якая можа раптоўна прадзерціся? І не з галавы бяру — быў, быў такі выпадак у нашым яшчэ халастым жыцці, калі за паўгадзіны да прыходу гасцей у ванне забіў фантан вады. Добра, што я прыйшоў раней.

Значыць, павінен я не толькі цвікі забіваць, але і ўбіраць, а яна — толькі гафтаваць крыжыкам, на кухні круціцца ці што там яшчэ... Тым больш што і ў гэтым абавязкі маёй жонкі сталі лягчэйшымі. Вось так мы, суровыя мужчыны, пераводзім увесь агонь на сябе. Растлумачу. На днях мы пайшлі па першыя пасля вяселля, лічыце, першыя ў сямейным жыцці, пакупкі. Звычайна якія рэчы для сумеснага ўжо дома набываюць маладыя? Вядома, халадзільнік і пральную машыну, без іх ніяк. Дык вось, гэтыя неабходныя прадметы ў нас ужо былі. Мы прыдбалі іх яшчэ год таму, калі вяселле было толькі ў планах.

Таму нашай першай сумеснай пакупкай быў кухонны камбайн. Так, вы маеце рацыю, паважаныя чытачы, ваш пакорлівы слуга, як і некаторыя з вас, таксама не сутыкаўся раней з гэтым спецыялістам кулінарных трукаў і гастранамічных вынаходніцтваў. Але затое зараз, калі б меў карэспандэнт спеўны голас, то абавязкова стварыў бы гімн у гонар гэтай машыны і выконваў бы яго кожным разам.

Нам было прыемна здзяйсняць пакупку (сумесны паход па магазінах, каб выбраць што-небудзь для дома, заўсёды цікавы) нават не ўдвая, а больш. Бо з усіх традыцыйных «мужчынскіх» і «жаночых» хатніх абавязкаў гатаванне ежы знаходзіцца недзе пасярэдзіне. Мужчынскі гонар не пацерпіць, калі прыгатаваць што-небудзь смачненькае сваёй каханай. Нездарма лепшыя кухары — мужчыны. Я сарамліва так магу пахваліцца, што валодаю некаторымі кулінарнымі прыёмамі і сакрэтамі. Такі я ідэальны, аж самому прыемна стала. І вельмі сціплы таксама. Таму калі ёсць час для гатавання, мы яго праводзім разам.

Але гэта так, лірычны адыход. Вернемся да нашага камбайна. Ведаеце, хоць я і не зусім цёмны чалавек, ды і жонка таксама лічыць сябе прасунутай у разнастайных сучасных тэхналогіях, на гэтага замежнага монстра мы глядзелі спачатку з нейкім спалохам. Пачалося ўсё з таго, што два кілаграмы нашай беларускай бульбы (дарэчы, з чаго гэта апошнія дзве зімы сталі прадаваць нейкія занадта вялізныя клубні, хто можа падказаць? Нават Ганна, якая пражыла гадоў дзесяць на Чукотцы, і тая памятае, што бульба раней была значна меншая па памерах, хоць і лічылася ў тым краі далікатэсам, і была рэдкасцю) машына парэзала на роўныя тонкія кавалачкі... Нізавошта не здагадаецеся, за колькі часу. За пяцьдзесят секунд! Аўтар спецыяльна, як цікаўны да розных механічных штучак, лічыў. І нават можна было хутчэй, але мы не паспявалі закідваць яе. А з вызгляду камбайнчык здаваўся такім крохкім...

Такім чынам, мы праводзілі выпрабаванні да трох гадзін ночы (ці раніцы, не ведаю, як больш трапна). Жонка — з жаночым азартам, а я — з інтарэсам, хутчэй, тэхналагічным. Спыніліся толькі таму, што скончыліся ў халадзільніку прадукты. Акрамя таго, я, напрыклад, эксперыментальным шляхам, даведаўся, што для таго, каб кактэйль атрымаўся з вялікай снежнай шапкай, трэба дадаць разам з астатнімі інгрэдыентамі адно, ці нават палову, яйка. Вось, паважаныя, якія разнастайныя, і, галоўнае, вельмі карысныя для жыцця веды можна набыць, узяўшы шлюб і купіўшы кухонны камбайн. Я нават без напамінаў, намёкаў і ўгавораў, добраахвотна, у здаровым розуме і цвёрдай памяці, самастойна памыў і расставіў для прасушкі ўсе ёмістасці цуда-машыны. Факт беспрэцэдэнтны.

Але на гэтым адказы на вечнае пытанне размеркавання хатніх абавязкаў не скончыліся. Для цікаўнасці я пачаў асцярожненька так апытваць сваіх знаёмых, хто чым у іх сям'і займаецца. І сустрэў цікавыя выпадкі. У аднаго калегі ёсць родная сястра-студэнтка, якая прыходзіць да яго два разы на тыдзень прыбіраць кватэру. За гэта жонка плаціць ёй грошы. Яшчэ адна сям'я склала расклад, па якіх тыднях хто адказвае за ўборку, хто — за мыццё. Быў выпадак, калі праз агенцтва адна сям'я знайшла нейкую ўдаву-генеральшу, якая песціла іх маленькіх дзетак, але гэта мне зусім ужо незразумела. Большасць жа з сямейных пар жыве паводле прынцыпу — хто свабодны, той і займаецца хатнімі справамі.

У нашай маладой сям'і, дарэчы, адбываецца амаль тое ж самае. Часам невядома, калі прыйдзеш з работы ці прыедзеш з камандзіроўкі, і ў маёй жонкі, якая працуе на тэлебачанні, аналагічная сітуацыя. Таму, хто першым ідзе дадому, той і крочыць у магазін. Хоць, шчыра кажучы, асабіста я да канца так і не высветліў прыроду размеркавання хатніх абавязкаў, але пераканаўся, што ў сям'і ўсе справы галоўныя, і няма розніцы, мужчына ці жанчына іх выконвае. Дарэчы, жонка таксама прытрымліваецца такога ж меркавання. Магчыма, таму мы ніколі не спрачаемся па дробных бытавых пытаннях. Тым больш што перадновагодні настрой вельмі спрыяе сямейным адносінам.

Сустрэнемся праз сем дзён. Няхай яны прынясуць вашай сям'і выключна добрыя падзеі.

**Дзмітрый АЛЬФЕР.**

### СЁННЯШНІ КАМЕНТАРЫЙ:

**Іна БАГАЕЎСКАЯ, рэдактар радыёстанцыі «Беларусь» (галоўная дырэкцыя замежнага вяшчання Беларускага радыё). Стаж сямейнага жыцця — 1,5 года:**

— У нас усе абавязкі падзяляюцца адвольна. Безумоўна, я ніколі не стану рамантаваць машыну ці свідраваць сцяну, таксама як і мой муж не будзе сам прышываць сабе гузік, калі побач з ім сяджу я. Але такія справы, як прыгатаванне вячэры, мы не дзелім. Ёсць моманты, калі мяне канчаткова адолее лянота, і тады Жэня робіць мне гастранамічны падарунак. Часцей на кухні варочаю посудам я, але зноў жа, побач са мною муж, прыемная яго прысутнасць. Сёння, у сучаснай сям'і быт настолькі палегчаны дзякуючы тэхніцы, што магчыма без клопатаў пазбегнуць непаразуменняў, але таксама даволі ўмоўна.

**«Неад'емныя» абавязкі. Жаночыя — сачыць, каб вопратка была чыстая і адпрасаваная, мужчынскія — каб пыласос працаваў, аўтамабіль ездзіў і палічкі віселі.**

Муз-news

## «Тяни-Толкай»: першы альбом новага года

**Першы альбом беларускіх артыстаў, датаваны 2008 годам, паспеў выпусціць гурт «Тяни-Толкай». Дакладней, гэта перавыданне — альбома «Як жа доўга я цябе шукаў». Да 15 трэкаў дабавіліся яшчэ дзве новыя кампазіцыі, а таксама два рэміксы. Для відэакліпа, які артысты таксама спадзяваліся запісаць на дыск, проста не хапіла месца.**

Прычынай перавыдання стала песня «А наперадзе ў нас яшчэ ўсё жыццё» — яна вельмі палюбілася слухачам, і многія цікавіліся, калі ж кампазіцыя будзе выдадзеная. «Наступны альбом мы плануем выдаць толькі ўвосень, так што вырашылі дапоўніць новым хітом папярэдні дыск», — тлумачыць саліст і аўтар песень Павел Клышэўскі. Другой навінкай стала «Вяртанне» — кавер папулярнай кампазіцыі ВІА «Верасы», які гучаў у праекце АНТ «Залатыя песні «Верасоў» у Мірскім замку.

Што датычыцца наступнага альбома, у ім гурт збіраецца заставацца верным сваёй стылістыцы, хіба што разбавіўшы лірыку некалькімі хуліганскімі песенькамі. Гэтаксама плануецца выпуск DVD, на якім змесцяцца кліпы і іншыя відэазапісы. Акрамя таго, налета чакаецца выхад на экраны мастацкага фільма Валерыя Тадароўскага «Бугі на касцях», дзе ўдзельнікі «Тяни-Толкай» сыгралі саміх сябе. Зусім нядаўна яны таксама зняліся ў расійскім фільме «Выклік», прычым у саўндтрэк карціны ўвайшлі дзве песні гурта — «3000 крокаў» і «Як жа доўга я цябе шукаў».

## Атмараві: лялечны тэатр

**Для здымак свайго другога па ліку кліпа рок-выканаўца Атмараві запрасіў... усіх ахвотнікаў. Для ўдзелу ў экранізацыі песні «Попелам па ветры» патрэбна было толькі з'явіцца па загадзя вызначаным адрасе і ўсміхнуцца ў аб'ектыў фатакамеры.**



Паводле слоў рэжысёра роліка Аляксандра Дутлава, для якога гэта работа стане дэбютнай, героямі відэакліпа стануць папяровыя фігуркі — для гэтага і спатрэбілася вялікая колькасць фатаздымкаў, якія потым будуць апрацаваны камп'ютарнай графікай. Прычым фатаграфавацца давялося нават самому Атмараві. Для яго, зрэшты, рэжысёр прыдумаў адразу дзве ролі: музыканта, які спявае на сцэне, і фатографа ў зале. У выніковым варыянце сцэна будзе папяровай, а ўсё, што на ёй адбываецца — пастаноўкай лялечнага тэатра. На ажыццяўленне ідэі адведзена некалькі месяцаў, а сам «драйвавы кліп на драйвавую песню» гледачы ўбачаць вясной 2008 года.

## Наталля Тамела: гары яно гарам!

**Рэжысёр Уладзімір Максімкаў прадставіў сваю новую работу — кліп на песню Наталлі Тамела «Аб ім». Відэаролік можна скачаць на партале TUT.BY (http://tut.by/filez/tamelo.avi), а ў бліжэйшы час — таксама і ўбачыць на тэлеканалах.**

Паводле сюжэта, спявачка доўга будуе дом з запалак, а потым спальвае яго. «Мы заўжды ў жыцці нешта будуем, а потым перапыняем стасункі з «аб'ектам будоўлі», — лічыць Наталля Тамела. — Нас ахоплівае сум, але часта гэты сум светлы, і час пацвярджае, што ўсё было не дарэмна. Аб гэтым і кліп — усё гарыць, але гэта не нагода ўспрымаць падзеі негатыўна. Усё да лепшага!».

Для таго, каб перадаць «натуральную» ноч і «сапраўдны» агонь, давялося выкарыстоўваць спецыяльную інфрачырвоную насадку на камеру. А дзеля здымак сола на палаючым саксафоне падрыхтавалі каскадзёрскі трук высокай складанасці — у кадры і інструмент, і саксафаніст згараюць. І хоць падобныя элементы — нятанны і расцягнуты ў часе працэс, але рэжысёр сцвярджае, што «ён за мастацтва» і «дапамагае нашым музыкантам хоць бы пагуляць у шоў-бізнэс».

## «Hair Peace Salon»: канцэртны бум

**Гурт «Hair Peace Salon» хоць і не раскручаны пакуль да ўзроўню «75 працэнтаў», але паспеў зарэкамендаваць сябе як адзін з самых актыўных рок-гуртоў мінулага года — за 2007-ы музыканты далі каля 30 канцэртаў, не прапускаючы ні адно рок-спаборніцтва. Напрыклад, калектыў спыніўся літаральна ў кроку ад фіналу тэлеконкурсу «Музычны плей-оф», а ў новым музычным праекце «Залатая акустыка» — жывое спаборніцтва гуртоў, якое адразу пасля выступлення ацэньваюць гледачы — трымаецца ў лідарах.**

«Нам вельмі прыемна, што творчасць так ацанілі. Пасля гэтых канцэртаў мы нават задумаліся над запісам акустычнага альбома», — разважае лідар калектыву Алег Вяль. Другі тур «Залатой акустыкі» стартуе 14 студзеня, але гурт мае намер выступіць не толькі ў гэтым спаборніцтве. Па выніках «Рок-спарынгу», які адбываўся ў снежні, гурт атрымаў магчымасць працы ў студыі гуказапісу. Акрамя таго, «салонныя» музыканты сур'ёзна рыхтуюцца да здымак кліпа. Хутчэй за ўсё, відэаролік будзе зроблены на адну з новых песень. Папярэдне мяркуецца, што праца над ім пачнецца ў лютым.

**Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## Падарожнічаць па Еўропе можна... у Беларусі

**Спачатку ў музеі Сучаснага выяўленчага мастацтва, дзе 18 снежня адкрылася першая выстава міжнароднага выставачнага тэматычнага праекта «Падарожныя нататкі. Еўропа». Але ўвесь наступны год выстава будзе вандраваць па сямі гарадах Беларусі — акрамя сталіцы яна яшчэ наведае Гомель, Магілёў, Гродна, Баранавічы, Брэст, Полацк.**

Свае нататкі прадстаўляюць творцы — мастакі і фатографы з Літвы, Польшчы, Швецыі, Германіі. Але разам з імі ў праекце ўзялі ўдзел мастакі з Беларусі Юрый Алісевіч і Аляксандр Вахрамееў. Яны прэзентуюць свае графічныя творы. Гэты фатаграфічна-графічны праект арганізаваны пры падтрымцы аддзялення Пасольства Швецыі ў Мінску, Інстытута Гётэ, Польскага інстытута, Пасольства Літоўскай Рэспублікі ў Беларусі.

Падарожныя нататкі — гэта сродак перадачы аўтарскіх адчуванняў. Іх робяць адразу, пакуль жывыя ўражанні, ці наадварот, калі прайшло нямала часу, калі памяць захоўвае самае значнае з успамінаў. Падарожныя нататкі робяць мастакі — атрымліваецца своеасаблівая інтэрпрэтацыя рэчаіснасці, прычым не абавязкова аб'ектыўная. Гэтага трэба якраз-такі чакаць ад фатаграфіі. Але нават фотаадлюстраванне можа быць суб'ектыўным, дзе адчуваецца погляд аўтара. Таму ўсе працы, якія ёсць на выставе, найперш захоўваюць эмоцыю, а не маюць на мэце даць інфармацыю пра ўбачаныя мясціны і цікавыя аб'екты. Вы ж разумееце: усё адносна...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Да груднога выкормлівання — з добразычлівасцю

**Незалежныя эксперты высока ацанілі работу па прапагандзе груднога выкормлівання ў Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы. Установе прысвоена званне «Арганізацыя аховы здароўя добразычлівага стаўлення да дзіцяці».**

Яшчэ на пачатку 90-х Сусветная арганізацыя аховы здароўя і Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ) у межах ініцыятывы «Бальніца добразычлівага стаўлення да дзіцяці» абвясцілі «Дзесяць прынцыпаў падтрымкі груднога выкормлівання». Мэтай гэтай ініцыятывы было змяненне рэжыму работы ў радзільных дамах, дзіцячых паліклініках, аддзяленнях для нованароджаных і дзяцей ранняга ўзросту дзіцячых бальніц такім чынам, каб павялічылася частата і працяглась груднога выкормлівання. Зараз у нашай краіне працуе Нацыянальная праграма падтрымкі груднога выкормлівання, дзейнічае Рэспубліканскі цэнтр падтрымкі груднога выкормлівання на базе Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця», а ў Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы 85 працэнтаў нованароджаных знаходзяцца на грудным выкормліванні.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

